

БЯСПЛАТНЫЯ МАРШРУТКІ ДЛЯ ВЫДАТНІКАЎ МС

ПРА БЯСПЕКУ ДЗІЦЯЧЫХ ПЛЯЦОВАК МС



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 ЧЭРВЕНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 164 (29031)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ЛІС, старшыня Брэсцкага аблвыканкама:**

*«Органы мясцовай улады павінны дэталёва прапрацаваць пытанне па выяўленні рэзерваў павышэння заработнай платы ў рамках дзеючага заканадаўства ў арганізацыях з нізкім узроўнем аплаты працы і адшукваць рэзервы для павышэння заработнай платы педагагічных работнікаў. Прынятыя ўрадам меры (павышэнне тарыфных ставак педагагічных работнікаў і памочнікаў выхавальнікаў, устанаўленне надбавак педработнікам) дазволілі павялічыць заработную плату педагогам вобласці. За першае паўгоддзе яна вырасла амаль на 20 % (у сярэднім на Br139,3) у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года (для прафесарска-выкладчыцкага складу — на 11,5 %, або на Br117). За студзень—чэрвень заработная плата педагагічных работнікаў склала Br845,6 — гэта трэцяе месца ў рэспубліцы пасля Мінска і Гомельскай вобласці, хоць яшчэ некалькі гадоў таму па гэтым паказчыку Брэсцкая вобласць была на апошнім месцы».*

# ПАЧАЦЬ З НОВАГА ЛІСТА

## Аляксандр Лукашэнка лічыць, што база ў беларуска-амерыканскіх адносінах на будучыню — іх шчырае абмеркаванне



Фота БелТА.

**Аб гэтым лідар краіны заявіў падчас сустрэчы з дарадчыкам Прэзідэнта ЗША па нацыянальнай бяспецы Джонам Робертам Болтанам у Палацы Незалежнасці ў Мінску.**

Нягледзячы на ўсю шуміху, якая адбываецца вакол паездкі амерыканскага палітыка, у ёй ёсць шмат станоўчага, асабліва для Беларусі, упэўнены Прэзідэнт.

«Станоўчае заключаецца ў тым — і нас ніхто ў гэтым не ўпікне, і вы, напэўна, ведаеце аб гэтым, — што мы пастаянна з моманту пагаршэння нашых адносін прапаноўвалі перагарнуць гэту старонку нядобрую і пачаць з новага ліста нашы адносіны», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да госця.

Візіт Джона Болтана беларускі лідар назваў гістарычным, бо такіх адметных высокапастаўленых фігур з гэтай краіны ў Беларусі не было даўно. Але бывалі шматлікія эксперты і спецыялісты з ЗША, з якімі кіраўнік краіны абмяркоўваў розныя тэмы двухбаковых стасункаў.

«Гэта сведчыць пра тое, што ў нас ёсць пэўная гісторыя перазагрузкі», — адзначыў Прэзідэнт.

Не зважаючы на абмежаванасць часу і візіту Джона Болтана, і самой сустрэчы, Аляксандр Лукашэнка прапанаваў абмеркаваць усе пытанні двухбаковых адносін «шчыра і нават па-сяброўску».

СТАР. 2

# Крылы Перамогі

**29 чэрвеня 1944 года скончылася Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён», падчас якой імклівым наступам была вызвалена ад гітлераўскіх захопнікаў уся тэрыторыя нашай краіны. 75-годдзе гэтай даты ўшанавалі на Кургане Славы.**

У экспазіцыі ваеннай тэхнікі, якая месціцца побач з мемарыяльным комплексам, — папаўненне. Цяпер там з'явіўся легендарны самалёт часоў Вялікай Айчыннай — штурмавік Іл-2. Яго экіпажы аказвалі нашым наземным войскам неацэнную дапамогу падчас баёў за Беларусь, пануючы ў паветры.

З ініцыятывай пашырэння экспазіцыі і ўстаноўкі Іл-2 выступіла Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі.

Дарэчы, работы па пошуку, рэстаўрацыі і ўстаноўцы штурмавіка каля падножжа Кургана Славы працягваліся больш за паўгода. Унікальную канструкцыю пастамента і арыгінальную сістэму падсветкі дапамагалі распрацоўваць студэнты-архітэктары.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

## КОРАТКА

- **БДУ ўкараніць электронныя залікоўкі.**
- Сяргей Гаўранін з Гродна вырасціў на лецішчы гарбуз вагой больш за 400 кг.



- **Купалаўскі тэатр пакажа ў юбілейным сезоне абноўлены спектакль «Тутэйшыя».**
- Экспедыцыя беларускіх палярнікаў адправіцца ў Антарктыду ў пачатку лістапада.

ISSN 1990 - 763X

Спадчына

# Алесь СУША: «Мабыць, упершыню за апошнія стагоддзі выданні Скарыны не вывозіліся з Беларусі, а прывозіліся»

**Днямі адбылася без перабольшання гучная падзея — прэзентацыя факсімільнага выдання Берасцейскай Біблії, мабыць, самай дарагой, вялікай і загадкавай кнігі ў гісторыі айчыннага кнігадрукавання наогул. Такі шыкоўны падарунак землякам зрабіла Нацыянальная бібліятэка Беларусі, якая рэалізавала праект сумесна з кампаніяй «Белнафтастрах». Падобны прыклад міжнароднага супрацоўніцтва і прыватна-дзяржаўнага партнёрства ў гэтай сферы далёка не першы: у свой час менавіта так былі вернутыя ў Беларусь многія выданні Францыска Скарыны, аднаўленыя Тураўскае і Слуцкае Евангеллі, першы ў свеце «Буквар»... Натуральна, аднаўленне нацыянальнай кніжнай спадчыны — справа не аднаго дня і нават не аднаго года. Што браць за пункт адліку, як працуюць кніжныя «Індыяны Джонсы» і як заахвочваць прыватны бізнес падтрымаць высакародную справу, размаўляем з намеснікам дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці, старшынёй Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў Алесем СУШАЙ.**



Так выглядае Берасцейская Біблія 2019 года выдання.

— Часам ідэі факсімільнага ўзнаўлення выношваюцца дзесяцігоддзямі. У самым канцы 1980-х — пачатку 1990-х быў пэўны бум факсімільнага перавыдання, — успамінае Алесь Аляксандравіч. — У той перыяд, калі ішло наноў дзяржаўнае будаўніцтва суверэннай Беларусі, многія даследчыкі і грамадскія дзеячы звярнуліся да каранёў: факсімільна перавыдалі пражскія выданні Скарыны, Статут Вялікага Княства Літоўскага, цэлы шэраг выданняў так званага новага беларускага адраджэння пачатку XX стагоддзя... Гэтыя выданні зрабілі выключную справу ў плане ўмацавання годнасці і гонару насельніцтва Беларусі за свае традыцыі, культуру.

СТАР. 4

# ПАЧАЦЬ З НОВАГА ЛІСТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Хай яны будуць непрыемныя для Беларусі, але мы павінны іх акрэсліць. А таксама шчыра і сумлена адназначыць пытанні перад вамі для далейшага нашага супрацоўніцтва — у тым ліку такія, якія, магчыма, будуць не вельмі прыемныя для Злучаных Штатаў Амерыкі. Гэта дазволіць стварыць нам базу адносін на будучыню, якая павінна быць паміж намі», — выказаў упэўненасць Прэзідэнт.

Джон Болтан згадзіўся, што візіт у Беларусь стаў добрай магчымасцю абмеркаваць шэраг вельмі важных праблем, у тым ліку пытанні рэгіянальнай бяспекі, а таксама двухбаковага супрацоўніцтва.

«Як вы правільна адзначылі, ёсць некалькі пытанняў, якія цікавяць Злучаныя Штаты: пытанні правоў чалавека, нераспаўсюджвання зброі. І я згодны з вамі, што трэба па гэтых тэмах размаўляць шчыра. Мы зможам знайсці агульную мову», — перакананы госць.

Ён адзначыў, што гісторыя не стаіць на месцы, — прайшло дастаткова шмат часу з распаду Савецкага Саюза. Геапалітычнае становішча мяняецца штохвілінна, а на сітуацыю ўплываюць і найбліжэйшыя краіны, і далёкія.

Размова Аляксандра Лукашэнкі і Джона Болтана працягвалася больш за дзве гадзіны і ахапіла шырокае кола пытанняў — і палітычных, і эканамічных.

«Гэта была вельмі важная сустрэча. Вядома, мы не прыйшлі да нейкіх канкрэтных рашэнняў, але вельмі важна было абмеркаваць усе тыя пытанні. Удзячны Прэзідэнту за магчымасць гэтай сустрэчы. Без такіх дыскусій вырашэнне праблем немагчыма», — сказаў журналістам дарадчык Прэзідэнта ЗША.

Ён згадзіўся, што існуюць пэўныя складанасці ў адносінах дзвюх краін, — пра гэта таксама зайшла гаворка з Аляксандрам Лукашэнкам. Тэмай размовы стала і новая геапалітычная рэальнасць, з якой дзяржавы вымушаныя лічыцца і ў якой павінны працаваць разам.

Адказваючы на пытанне пра бачанне перспектыў Беларусі, дарадчык падкрэсліў: ЗША цвёрда падтрымліваюць незалежнасць і суверэнітэт. Так, некаторыя дзяржавы аддаюць перавагу частковай адмове ад незалежнасці, як краіны Еўрапейскага саюза; іншыя прыходзяць да высновы, што такое рашэнне памылковае, як Злучанае Каралеўства.

«Гэта рашэнне, якое павінен прымаць народ. Толькі народ з'яўляецца крыніцай і носьбітам суверэнітэту. Таму беларускі народ павінен вырашаць, жадае ён заставацца суверэнным альбо не. Маё ўражанне — што жадае», — мяркуе Джон Болтан.

**Варвара МАРОЗАВА.**

**• Да ведама**

Дыпламатычныя адносіны паміж Беларуссю і Злучанымі Штатамі ўсталяваныя ў снежні 1991 года, Аляксандр Лукашэнка тройчы наведваў гэту краіну. У 2004—2008 гадах Вашынгтон зрабіў шэраг недружалюбных крокаў супраць Мінска, у тым ліку ўвёў санкцыі. Беларусь адказала зніжэннем узаемнага дыпламатычнага прадстаўніцтва і абмежаваннем колькасці супрацоўнікаў пасольстваў.

Прагрэс у адносінах з ЗША назіраецца з 2012 года, паменшылася інтэнсіўнасць крытычных заяў амерыканскіх службовых асоб. У 2015-м адменены санкцыі супраць «Беларуснафты», прыпынена дзеянне санкцый супраць «Белнафтахіму» і яго прадпрыемстваў.

Сёлета ў сакавіку амерыканскі бок праінфармаваны аб адмене абмежаванняў на колькасць супрацоўнікаў Пасольства ЗША.

Мінск і Вашынгтон супрацоўнічаюць па пытаннях барацьбы са злачыннасцю, гандлем людзьмі і тэрарызмам, абыходжання з радыеактыўнымі матэрыяламі, у ваеннай сферы, ахове здароўя, сельскай гаспадарцы, у галіне прафесійных абменаў.

Летась ЗША сталі лідарам па аб'ёме аказання Беларусі замежнай бязвыплатнай дапамогі — 11,4 мільёна долараў. Тавараабарот летась узрос на 17,6 працэнта да 711,6 мільёна долараў. Беларусь у асноўным экспартуе ў Амерыку калійныя ўгнаенні, бясшвовыя трубы і профілі з чорных металаў, рэнтгенаўскую апаратуру, мэблю, азотныя ўгнаенні, дрот з нелегіраванай сталі, ільняную тканіну.

У першым паўгоддзі тавараабарот яшчэ ўзрос — на 44,7 працэнта да адпаведнага ўзроўню мінулага года — і склаў 478 мільёнаў долараў.

Сацыяльны вектар

# Прыемныя клопаты

**Беларускі Саюз жанчын у апошнія перадвучэбныя дні па традыцыі разгарнуў рэспубліканскую акцыю «Збяром партфель разам». Сёлета дабрачыннаму праекту спаўняецца пяць гадоў.**

Адна з самых масавых грамадскіх арганізацый Беларусі даказвае: калі жанчыны аб'ядноўваюцца, яны могуць многае. Днямі прадстаўніцы БСЖ завіталі з падарункамі ў госці да соцень дзяцей: наведалі шматдзетныя сем'і, сацыяльныя прытулкі і дзіцячыя дамы, прафесійна-тэхнічныя вучылішчы за крыгатага тыпу.

— Кожнае дзіця ў нашай краіне — прыярытэт дзяржаўнай палітыкі. Важна, каб у Дзень ведаў дзеці гэта адчувалі і з добрым настроем пачыналі вучэбны год. Але галоўнае не толькі ў тым, каб забяспечыць хлопчыкаў і дзяўчынак усім неабходным для школы, абуць, адзець, але і ў тым, каб аб'яднацца і працягнуць руку дапамогі дзецям, якім патрэбна падтрымка дарослых. Намаганні ўсіх, хто клапоціцца пра падрастаючае пакаленне, несумненна акупяцца ў будучыні, — упэўнена **намеснік старшыні БСЖ *Лілія АНАНІЧ*.**

Дзякуючы шырокай сетцы пярвічак Саюза жанчын у рэгіёнах праект закрануў усе вобласці. Падтрымку атрымалі таксама дзеці з аддаленых вёсак. Так, Жлобінская раённая арганізацыя БСЖ правяла акцыю пад дэвізам «С радушием — в Радушу, со щедростью — в Щедрин». Будучым вясковым першакласнікам уручылі партфелі, поўнасцю ўкамплектаваныя ўсім неабходным, і павіншавалі дзяцей з надыходзячым святам. А, напрыклад, жанчыны Гродненскага раёна правялі перадсвяточную сустрэчу са скідзельскімі хлопчыкамі і дзяўчынкамі ў бібліятэцы сямейнага чытання: прывезлі падарункі і настроілі школьнікаў на вучэбны лад за кубкам гарбаты.

Акцыя «Збяром партфель разам» не мае часовых абмежаванняў і будзе працягвацца далей. Далучыцца можа кожны праз любую арганізацыю БСЖ.

**Ганна КУРАК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Лідара «Слугі народа» абралі спікерам Вярхоўнай Рады Украіны



Кіраўнік праппрэзідэнцкай партыі «Слуга народа» Дзмітрый Разумкоў абраны спікерам парламента Украіны. За адпаведнае рашэнне прагаласавалі 282 дэпутаты Вярхоўнай Рады пры 226 неабходных. Рада вызначылася і з пасадай першага віцэ-спікера. На галасаванні 330 дэпутатаў падтрымалі на гэтай пасадзе прадстаўніка прэзідэнта Украіны ў парламенце Руслана Стэфанчука. Віцэ-спікерам Рады была абраная Алена Кандрацюк ад партыі «Бацькаўшчына». Таксама Вярхоўная рада прызначыла намесніка кіраўніка Офіса Прэзідэнта па эканамічных пытаннях Аляксея Ганчарука прэм'ер-міністрам Украіны.

## Пакістан правеў пуск балістычнай ракеты, здольнай несці ядзерны зарад

У Пакістане ваенныя абвясцілі аб паспяховых выпрабаваннях балістычнай ракеты «Газнаві» класа «зямля—зямля», здольнай несці ядзерную боегалоўку. Пра гэта паведаміў прэс-сакратар узброеных сіл краіны Асіф Гафуры і выклаў відэазапіс пуску ў «Твітары». Ён удакладніў, што гэтая ракета здольная дастаўляць розныя тыпы боегаловак на адлегласць да 290 кіламетраў. «Газнаві» (вядомая таксама як «Хатф III») разлічана на дастаўку ў тым ліку ядзерных боегаловак вагой да 700 кілаграмаў. Яе распрацоўкай займаўся Комплекс нацыянальнага развіцця Пакістана. Выпрабаванні прайшлі на фоне нядаўняга абвастрэння адносін паміж Індыяй і Пакістанам: у жніўні Нью-Дэлі вырашыў пазбавіць штат Джаму і Кашмір спецыяльнага статусу і ўвёў на яго тэрыторыі прамое кіраванне; Ісламабад раскрытыкаваў гэтае рашэнне, убачыўшы ў ім пагрозу этнічных і рэлігійных чыстак. Улады Пакістана панізілі статус дыпламатычных адносін з Індыяй, забаранілі ўзаемны гандаль і перарвалі чыгуначныя і аўтобусныя зносіны з Індыяй. Як вядома, у канцы мая Ісламабад выпрабаваў ракету «Шахін-2», якая таксама можа несці ядзерны зарад.

## Адкрыўся 76-ы міжнародны Венецыянскі кінафестываль



У Італіі на востраве Лідо адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця 76-га Венецыянскага міжнароднага кінафестывалю. Па чырвонай дарожцы прайшлі ўдзельнікі агляду і члены журы, кіраўніком якога сёлета стаў аргенцінскі рэжысёр Лукрэсіо Мартэль. У конкурснай праграме фестывалю — 21 карціна, у тым ліку фільмы Рамана Паланскі, Роя Андэрсана, Аліўе Асаяна, Ноа Баўмбака, Атама Эгаяна, П'етра Марчэла, Стывена Содэрберга і Тода Філіпса. Кінафестываль адкрыўся сусветнай прэм'ерай фільма «Праўда» Хіракадзу Карээда, лаўрэата «Залатой пальмавай галінкі» за «Крамных зладзюжак» (2018). Дзеянне карціны адбываецца ў Францыі, галоўныя ролі выканалі Катрын Дэнёў, Жульет Бінош і Ітан Хоўк.

Знешняя палітыка

# ЗНОЎ ПРА ВІЗЫ І МІЖНАРОДНУЮ БЯСПЕКУ

**Міжнародная канферэнцыя высокага ўзроўню, прысвечаная барацьбе з тэрарызмам, пройдзе ў Мінску 3-4 верасня. У форуме «Барацьба з тэрарызмам пры дапамозе інавацыйных падыходаў і выкарыстання новых і ўзнікаючых тэхналогій» будуць удзельнічаць прадстаўнікі больш чым 50 краін, расказаў падчас брыфінгу прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Беларусі Анатоль ГЛАЗ.**

Арганізатары мерапрыемства — МЗС і Контртэрарыстычнае ўпраўленне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Яно лагічна працягвае міжнародную сустрэчу высокага ўзроўню, якая адбылася ў Мінску пад эгідай АБСЕ ў кастрычніку мінулага года.

Амаль 60 дэлегацый на канферэнцыі будуць прадстаўляць звыш 50 краін і міжнародныя, няўрадавыя арганізацыі, акадэмічныя колы.

У ліку спікераў і гасцей мерапрыемства плануецца ўдзел кіраўнікоў міжнародных структур, якія адказваюць за бяспеку, — паведаміў Анатоль Глаз.

На форуме паспрабуюць выпрацаваць рашэнні на глабальным, рэгіянальным і нацыянальным узроўнях па барацьбе з тэрарыстамі і тэрарыстычнымі групамі ва ўмовах большай даступнасці і росту складанасці тэхналогій.

Анансаваў Анатоль Глаз палітычныя кансультацыі паміж міністэрствамі замежных спраў Беларусі і Чылі, якія адбудуцца ў Мінску 3 верасня, і 27-е пасяджэнне ў Кіеве міжурадавай беларуска-ўкраінскай змешанай камісіі па пытаннях гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. «Украіна — важны для нас гандлёва-эканамічны партнёр. У 2018 годзе яна была на другім месцы сярод усіх гандлёвых партнёраў нашай краіны па аб'ёмах тавараабароту і экспарту», — падкрэсліў прэс-сакратар МЗС.

Плануецца, што на сустрэчы абмяркуюць сумесныя мерапрыемствы, у тым ліку Другі форум рэгіёнаў Беларусі і Украіны, запланаваны на 3-4 кастрычніка.

Чарговы раўнд беларуска-мангольскіх палітычных кансультацый паміж міністэрствамі замежных спраў адбудзецца 5 верасня ў Мінску. Бакі абмяркуюць актуальныя пытанні супрацоўніцтва, каардынацыю ўзаемадзеяння ў рамках міжнародных арганізацый, праблематыку міжнароднага парадку дня.

Адказваючы на пытанне аб чарговым пераносе даты падпісання пагадненняў аб рэадмісіі і спрашчэнні візавага рэжыму паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам, Анатоль Глаз адзначыў: «Як неаднаразова ўжо заяўлялася, мы з еўрапейскімі партнёрамі сумесна рухаемся да заключэння пагаднення аб спрашчэнні візавых фармальнасцяў і рэадмісіі. У цяперашні час неабходныя для падпісання працэдуры бакамі яшчэ не завершаны. Разам з тым мы па-ранейшаму зыходзім з таго, што нашы планы ў агляднай перспектыве ажыццявяцца».

Ён таксама паведаміў, што Беларусь не атрымлівала афіцыйнае запрашэнне літоўскага боку для ўрадавай дэлегацыі на цырымонію перапахавання астанкаў Кастуся Каліноўскага ў Вільнюсе.

Прэс-сакратар таксама патлумачыў журналістам, чаму на памятных мерапрыемствах у Варшаве да 80-годдзя пачатку Другой сусветнай вайны Беларусь будзе прадстаўлена на ўзроўні пасла: «Яшчэ раз падкрэслю: менавіта ўсе, без выключэння, народы Савецкага Саюза зрабілі вызначальны ўнёсак у агульную перамогу над нацызмам. Вызваленне Усходняй і Цэнтральнай Еўропы, канчатковы разгром нацызму на тэрыторыі Германіі сталі магчымыя дзякуючы гераічным намаганням усёй шматнацыянальнай Чырвонай Арміі. Гэта не памяншае ролі саюзных армій, але трактаваць інакш, падзяляць унёсак саюзных рэспублік у агульную перамогу, на нашу думку, мякка кажучы, як мінімум гістарычна няправільна. Пры гэтым у Варшаву не былі запрошаныя краіны Цэнтральнай Азіі, Казахстан, Расія». Разам з тым, улічваючы, што вайна з самага пачатку закранула тэрыторыю Беларусі, наша краіна прыняла рашэнне аб удзеле ў памятных мерапрыемствах.

Анатоль Глаз адзначыў, што тэма ваенных падзей звязаная для беларусаў, і падзякаваў польскаму боку за запрашэнне.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# НАДЗЁННЫЯ ПЫТАННІ

**Па традыцыі ў гэтую суботу, 31 жніўня, з 9.00 да 12.00 адбудуцца чарговыя прамыя тэлефонныя лініі. На званкі грамадзян адкажуць кіраўнікі мясцовых органаў улады:**

кіраўнік спраў БРЭСЦКАГА аблвыканкама Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО (8 016 221 31 21);

кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ (8 021 222 22 22);

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ (8 023 233 12 37);

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК (8 015 273 56 44);

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН (8 022 250 18 69);

старшыня МІНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ (8 017 500 41 60);

першы намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ (8 017 222 44 44).

Прырода і людзі

# НА ЗЯЛЁНАЙ ХВАЛІ

**Людзі ўсё больш цікавяцца экалагічным станам наваколля, але для атрымання гэтай інфармацыі ім часта ствараюць перашкоды. Як вырашыць праблему, расказалі эксперты.**

## ПАЧУЦЬ МЕРКАВАННЕ ІНШЫХ

— Грамадзяне сталі больш дасведчаныя ў пытаннях прыродаахоўнага заканадаўства і выдатна ведаюць свае правы на спрыяльнае навакольнае асяроддзе, — расказаў **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр КОРБУТ.** — Можна сказаць, у беларускім грамадстве сфарміраваўся запыт на якасць навакольнага асяроддзя і звязаныя з ёй даброты.

Па словах намесніка міністра, усе пытанні можна вырашыць пры ўмове выканання прадугледжаных заканадаўствам патрабаванняў і працэдур, у тым ліку працэдуры правядзення ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе (АУНА), адказнасць за выкананне якой нясе інвестар, што плануе ажыццяўляць дзейнасць. Пры гэтым правядзенне АУНА, грамадскага абмеркавання і дзяржаўнай экалагічнай экспертызы спрыяюць недапушчэнню забруджвання паветра, водных аб'ектаў, страты біялагічнай разнастайнасці, а таксама дапамагаюць арганізацыі ўстойлівага прыродакарыстання, укаранення новых экалагічна чыстых тэхналогій.

— На жаль, даводзіцца канстатаваць часам нізкі ўзровень прымянення заканадаўчых нормаў як сярод інвестараў, так і органамі выканаўчай улады, — адзначыў Аляксандр Корбут. — Менавіта такі падыход і стварае тыя сітуацыі сацыяльнай незадаволенасці, якія мы сёння маем. Складаецца ўражанне, што экалагічныя аспекты рэалізацыі планаванай дзейнасці недаацэньваюцца на месцах, выпускаецца з-пад увагі тое, што грамадскасць павінна ўзяць актыўны ўдзел у абмеркаванні гэтай дзейнасці.

Як адзначыў намеснік міністра, важную ролю ў рэгуляванні ўздзеяння на наваколле адыгрывае дзяржаўная экалагічная экспертыза.

— Яна праводзіцца па перадпраектнай, перадінвестыцыйнай дакументацыі, а таксама на заключным этапе, калі аб'ект уводзіцца ў эксплуатацыю. Пры гэтым правядзенне экалагічнай экспертызы на стадыі распрацоўкі перадпраектнай дакументацыі дае магчымасць любому інвестару на самым раннім этапе прыняць правільнае кіраўніцкае рашэнне.

**Намеснік дырэктара па дзяржаўнай экалагічнай экспертызе Рэспубліканскага цэнтра дзяржаўнай экалагічнай экспертызы і павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў Мінпрыроды Яўген РАЧЭЎСКІ** расказаў, што спецыялісты цэнтра працуюць над тым, каб спрасціць і аптымізаваць досыць складаную сёння працэдуру дзяржаўнай экалагічнай экспертызы, каб яна была зразумелая і даступная для ўсіх ахвотных.

Сярод актуальных праблем Яўген Рачэўскі назваў тое, што органы мясцовай выканаўчай улады праяўляюць нізкую актыўнасць, не бяруць удзел у навучальных семінарах, якія праводзіць цэнтр. Гэта прыводзіць да няправільнага правядзення грамадскіх абмеркаванняў, што ў выніку выклікае пэўную напружанасць у грамадстве.

— Мы планамерна працуем над тым, каб літаральна кожная адміністрацыйная адзінка ў нашай краіне набыла навыкі правядзення грамадскіх абмеркаванняў, — падкрэсліў спецыяліст. — Акрамя таго, у рамках удасканалення экспертызы прапанаваны шэраг механізмаў вырашэння складаных пытанняў для зніжэння сацыяльнай напружанасці. Калі нас падтрымае Мінпрыроды, мы сумесна зможам вынесці гэтыя пытанні на заканадаўчы ўзровень і адрэгуляваць іх у частцы забеспячэння спакою насельніцтва пры стварэнні тых ці іншых аб'ектаў.

**Старшыня міжнароднага грамадскага аб'яднання «Экапартнёрства» Юлія ЯБЛОНСКАЯ** адзначыла, што ўдзел грамадскасці ў прыняцці рашэнняў трэба забяспечыць на ўсіх стадыях — ад распрацоўкі праграм, стратэгій, планаў да канкрэтных тэхнічных рашэнняў, і чым на больш раннім этапе (напрыклад, разгляду перадпраектнай дакументацыі), тым лепш.

Пры гэтым, па яе словах, у мясцовых органаў улады нізкая зацікаўленасць у інфармаванні жыхароў пра свае планы — на гэта патрабуюцца дадатковыя рэсурсы, акрамя таго, людзі могуць выказваць незадаволенасць планамі. Таму іх часта імкнуцца не афішаваць, што ў выніку можа прывесці да яшчэ большага па маштабах шуму.

— Важна разумець, што патрэба жыхароў краіны ва ўліку іх меркавання ўзрастае, і яна будзе расці далей, — падкрэсліла Юлія Яблонская. — Таму спачатку трэба праводзіць кансультацыі, а затым ужо прымаць рашэнні.

## «ГАРАЧЫЯ» ПУНКТЫ

Расказаў Аляксандр Корбут і пра сітуацыю на аб'ектах, будаўніцтва якіх апошнім часам выклікае незадаволенасць грамадства:

— Што датычыцца акумулятарнага завода «АйПаўэр», то гэтае прадпрыемства мае станоўчае заключэнне дзяржаўнай экалагічнай экспертызы, згодна з якім яно будзе перапрацоўваць 13 156 тон свінцу ў год, а выкіды складуць 3,05 кг. Калі завод выканае дадзеныя абавязацельствы, ёсць магчымасць, што ён запусціцца. Калі ж будуць якія-небудзь парушэнні, якія перашкодзяць выканаць гэтыя патрабаванні, Мінпрыроды не дазволіць увесці яго ў эксплуатацыю. Так, калі завод пасля праведзеных змен выйдзе за дазволеныя межы выкідаў, ён павінен будзе зноў правесці грамадскае абмеркаванне і падаць заяўку на змяненне праектнай дакументацыі.

Завод жа сульфатнай беленай цэлюлозы на Светлагорскім ЦКК, па словах Аляксандра Корбута, цяпер праводзіць пусканаладачныя работы. Распрацоўваецца методыка па вызначэнні выкідаў метылмеркаптанаў (атрутных рэчываў, якія маюць моцны непрыемны пах), закуплена адпаведнае абсталяванне. Як толькі методыка будзе распрацавана, інфармацыя пра выкіды будзе, як і абяцана кіраўніцтвам прадпрыемства, размяшчацца на табло завода.

— Пакуль гэты завод не працуе, Мінпрыроды праводзіць агульны кантроль за выкідамі, — расказаў Аляксандр Корбут. — Пры гэтым меркаванне Мінпрыроды адназначнае: ніякіх выкідаў, ніякіх пахаў быць не павінна. І мы на гэта нацэльваем кіраўніцтва завода.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

Чулі?!

# Карстэн сыходзіць

Двухразовая алімпійская чэмпіёнка ў акадэмічным веславанні Кацярына Карстэн учора абвясціла пра завяршэнне кар'еры




**Ад яе заўсёды чакалі самых высокіх вынікаў. Яе так і звалі — Кацярына Вялікая. Перад любой Алімпіядай, пралічваючы перспектывы беларускай каманды, вяслярку нязменна запісвалі ў лік тых, хто абавязкова паднімецца на п'едэстал.**

«Я хачу аб'явіць пра завяршэнне сваёй спартыўнай кар'еры і ў сувязі з гэтым падзякаваць усім, хто дапамагаў, падтрымліваў і арганізоўваў маю падрыхтоўку, а таксама сваім напарніцам, урачам, масажыстам, партнёркам па камандзе, мужу, балельшчыкам, журналістам», — сказала Кацярына Карстэн. Спартсменка адзначыла, што рыхтавалася да сваёй восьмай Алімпіяды, але напярэдадні ліцэнзійнага чэмпіянату свету, які праходзіць гэтымі днямі ў Лінцы, зламала рабро і не змагла ўдзельнічаць у сусветным форуме, таму і завяршае кар'еру.

Праслаўленая спартсменка дадала, што цяпер Беларуская федэрацыя веславання дапамагае ёй у пошуках адпаведнай работы. Кацярына пакуль не бачыць сябе ў ролі трэнера. Яна толькі плануе, што з Германіі, дзе цяпер пражывае яе сям'я, пераедзе ў Беларусь. Таксама 2 верасня Карстэн возьме ўдзел у алімпійскім уроку «Веды — сіла!», які пройдзе ў Зале алімпійскай славы Нацыянальнага алімпійскага камітэта.

Кацярына Карстэн з'яўляецца першай двухразовай алімпійскай чэмпіёнкай (1996, 2000) у гісторыі незалежнай Беларусі і шасціразовай чэмпіёнкай свету (1997, 1999, 2005, 2006, 2007, 2009). Узнагароджана ордэнам Айчыны I, II і III ступеняў, ордэнам Пашаны, медалём «За працоўныя заслугі». Лаўрэат прэміі «Беларускі спартыўны Алімп».

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

Надвор'е

# Цяпло не адступае

Канец жніўня і пачатак верасня чакаюцца гарачыя

**Сёлетняе лета, здаецца, вырашыла завяршыць свой час мажорным акордам. Цёплае і без ападкаў надвор'е, якое пануе ў Беларусі ўжо больш за тыдзень, свае пазіцыі пакуль здаваць не збіраецца. Падрабязней пра сінаптычную абстаноўку расказалі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У пятніцу, аднак, антыцыклон, які забяспечыў нам камфортнае надвор'е цягам апошніх дзён пачне адступаць. З Польшчы да нас будзе змяшчацца франтальны падзел. Але істотна надвор'е ён не пагоршыць. Пераважна па паўночна-заходняй палове чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі прагрымяць навальніцы. Але будзе цёпла — 21—27 цяпла, а па захадзе і наогул да плюс 31.

У суботу франтальны падзел разам з дажджамі перамесціцца на ўсходнія раёны Беларусі. А з захаду да нас прыйдзе новы цёплы антыцыклон. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі згусцяцца невялікія туманы. Слупкі тэрмометраў уначы пакажуць ад 12 да 17 са знакам «плюс», а ўдзень будзе ад 22 да 29 градусаў.

Пачатак верасня выдасца яшчэ цяплейшым. У нядзелю ападкаў на тэрыторыі Беларусі не чакаецца ўвогуле, а вось у панядзелак па крайнім захадзе невялікія навальнічныя дажджы ўсё ж магчымыя. Ноччу і раніцай чакаюцца слабыя туманы. Вецер будзе лёгкі, але ў панядзелак узмоцніцца да ўмеранага. Тэмпература паветра ўдзень дасягне 25—32 градусаў. Уначы таксама халадна не будзе — ад 10 да 18 цяпла.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Новыя кнігі

# Рабіндранат Тагор: сіла міралюбства

**Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь сабраў на прэзентацыю кнігі аднаго верша Рабіндраната Тагора «Мая залатая Бенгалія» на мовах свету» прадстаўнікоў розных краін.**



У госці ў аўтарытэтную асветніцкую ўстанову прыйшлі дыпламаты Індыі, Казахстана, Украіны, Грузіі, Польшчы, прадстаўнікі беларускага ўрада — міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч, начальнік Галоўнага ўпраўлення Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі Міністэрства замежных спраў Віктар Рыбак, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар Марзалюк, старшыня Дзіцячага Фонду ААН ЮНІСЭФ у Рэспубліцы Беларусь Рашэд Мустафа Сарвар, намеснік старшыні ФНКА «Беларусы Расіі» паэт і празаік Валерый Казакоў і шмат хто яшчэ.

Усіх сабрала адна нагода — творчы праект, які можна лічыць ці не першым складнікам у падмурку беларуска-бангладэшскіх гуманітарных адносін. Верш «Мая залатая Бенгалія», напісаны ў пачатку XX стагоддзя, з'яўляецца яшчэ і тэкстам гімна Бангладэш. Дарэчы, гімн Індыі таксама напісаны на верш Тагора.

Пра гэта нагадала Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Індыя ў Рэспубліцы Беларусь, спадарыня Сангіта Багадур, якая прачытала «Маю залатую Бенгалію» на мове хіндзі. У кнізе, выдадзенай Паліграфічным камбінатам імя Якуба Коласа, між іншым, змешчаны пераклады на 50 моў свету. Бенгальская, мова арыгінала, — 51-я. Зборнік «Мая залатая Бенгалія» на мовах свету» ўжо вытрымаў два выданні.

Унікальнай назваў падзею прадстаўлення кнігі класіка бенгальскай літаратуры спадар Рашэд Мустафа Сарвар, які нарадзіўся і доўгі час жыў у Бангладэш. «Я выпеставаны з імем Тагора, падлеткам адкрыў яго кнігі, юнаком я захапіўся яго песнямі, музыкай», — заўважыў Рашэд Сарвар і прачытаў легендарны твор на роднай бенгальскай мове. Гучалі словы Тагора і на украінскай, грузінскай, казахскай мовах. І, вядома ж, на беларускай. У зборнік увайшлі пяць розных варыянтаў перааўвасаблення верша на беларускую мову. Іх перакладчыкі — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Мікола Мятліцкі, паэты Марыя Кобец, Надзея Салодкая, Навум Гальпяровіч, Сяргей Панізнік. Трое з перакладчыкаў — Мятліцкі, Кобец і Гальпяровіч — прысутнічалі ў зале Нацыянальнага гістарычнага, іх пераклады гучалі ў аўтарскім выкананні.

Кранальным было выступленне аднаго з укладальнікаў кнігі — бангладэшскага перакладчыка Музахідула Іслама, які жыве і працуе ў Беларусі. Вельмі грунтоўна пра жыццё і творчасць Рабіндраната Тагора, які імкнуўся паяднаць культуры Усходу і Захаду, расказаў прафесар, доктар гістарычных навук Ігар Марзалюк. Унікальным аздабленнем музейнай прэзентацыі сталі і рэпрадукцыі работ вядомага мастака Бангладэш Зейнала Абедзіна. Яго серыя малюнкаў «Голад у Бенгаліі», створаная ў 1940-я, стала ілюстрацыйным матэрыялам да кнігі аднаго верша на мовах свету.

**Кастусь ХАДЫКА.**

# «Мабыць, упершыню за апошнія стагоддзі выданні Скарыны не вывозіліся з Беларусі, а прывозіліся»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Я быў зусім малы, але памятаю, з якім гонарам хадзілі мае бацькі, атрымаўшы ў рукі Статут ВКЛ ці трохтомнік Скарыны. Калі ўжо настаў перыяд стабілізацыі, у тым ліку ў галіне культуры і ў бібліятэчнай справе, калі ў поўнай меры сфарміравалася навуковае асэнсаванне беларускай мінуўшчыны, бачанне перспектыў, куды наша краіна ідзе, мы прыступілі да больш сістэмнага аналізу сваіх набыткаў. Я прыйшоў у 2004 годзе ў Нацыянальную бібліятэку, і мы абмяркоўвалі як амаль нерэальныя задумкі — было б хораша выдаць Берасцейскую Біблію, усе выданні Скарыны факсімільна ўзнавіць, проста дзеля таго, каб іх убачыць, бо цалкам, у добрым стане іх няма ні ў адной бібліятэцы свету, тым больш няма ў Беларусі. У 2006 годзе, калі бібліятэка пераехала ў новы будынак, склаліся даволі спрыяльныя абставіны для таго, каб паспрабаваць вярнуць некаторыя кніжныя помнікі. Спачатку мы выступалі як дапаможная сіла — супрацоўнічалі з Акадэміяй навук, некаторымі выдавецтвамі ў рэалізацыі падобных праектаў. Часам ініцыявалі іх: напрыклад, пасля цудоўнага з'яўлення Слуцкага Евангелля якраз нашы спецыялісты ідэнтыфікавалі і апісалі яго і ініцыявалі фундаментальнае навуковае даследаванне, а ў выніку было падрыхтавана ўзнаўленне спачатку ў электронным, а потым і ў факсімільным выглядзе.



Таніраванне абрэза кнігі ў традыцыйныя для XVI стагоддзя колеры: цёмна-зялёны і залаты.

З 2009 года мы пачалі рабіць кніжныя ўзнаўленні ўжо ўласнымі сіламі. Першым стаў фактычна даведнік — дапаможнік для Кацярыны II па беларускіх губернях (яна ў 1780 годзе рабіла падарожжа па новадалучаных да Расійскай імперыі беларускіх землях, і расійская Акадэмія навук адмыслова зрабіла даведнік па ўсіх гарадах і вёсках, праз якія пралягаў маршрут). Гэта было цікавае выданне, даволі рэдкае ў Беларусі. Фактычна ад пачатку да канца я займаўся гэтай работай, ад сканавання і апрацоўкі кожнага малюнка да напісання навуковага тэксту і падрыхтоўкі кнігі да друку. З таго часу да 2012 года мы ўжо распрацавалі цэлую праграму па факсімільным узнаўленні кніжных помнікаў, асабліва тых, якія не захаваліся ў Беларусі. Прычым галоўнае — нават не матэрыяльнае іх вяртанне, каб кніга была ў бібліятэцы, а вяртанне ў грамадскую свядомасць, каб у Беларусі гаварылі пра гэта і ведалі, чым яшчэ мы можам ганарыцца. Работа стала сістэмнай, і на сёння ўжо ёсць дакладнае разуменне, што трэба вяртаць і як гэта рабіць — то-бок, амаль кожны год рэалізуюцца цікавыя, прадуманыя і загадзя падрыхтаваныя ініцыятывы, якія часам гадоў пяць абдумваюцца, гады з тры-чатыры рэалізуюцца, прымяркоўваюцца да значных агульнадзяржаўных ці нават міжнародных падзей, дат, як гэта было з 400-годдзем першага «Буквара».

У 2012 годзе апякунскі савет Нацыянальнай бібліятэкі зацвердзіў цэлы спіс кніжных помнікаў, вартых узнаўлення. Адкрывае яго рэлігійная літаратура, што лагічна, бо самыя старажытныя кніжныя рарытэты якраз маюць царкоўнае паходжанне, першыя свецкія, мастацкія і навуковыя выданні з'явіліся пазней. Але, безумоўна, ёсць у спісе і іншыя аб'екты, вяртанне якіх у Беларусь таксама вельмі важнае.

***— Сярод «нерэлігійных», помніца, кіраўнік бібліятэкі Раман Матульскі называў «Мастацтва артылерыі» Казіміра Семяновіча. Якія яшчэ кнігі і аўтары стаяць у планах на ўзнаўленне?***

— Абсалютна розныя. Ведаеце, якой была ідэя? Раскрыю карты. Кожны такі праект каштуе даволі вялікіх грошай. Прытым, на наш погляд, з многіх прычын рэалізоўваць іх немэтазгодна за бюджэтныя сродкі, якія больш патрэбны для развіцця бібліятэчнай справы, вырашэння сістэмных, стратэгічных задач, у той час як факсімільнае ўзнаўленне — хутчэй, іміджавыя праекты. Таму мы склалі рэестр прывабных «інвестыцыйных праектаў» па вяртанні ў грамадскі ўжытак найбольш знакавых кніжных помнікаў беларускага паходжання, забытых ці адсутных у Беларусі, і прапанавалі ўдзел у іх камерцыйным установам — бізнесу, кампаніям, якія маглі б рэалізаваць добрыя ідэі. І гэта практыка мецэнацтва, прыватна-дзяржаўнага партнёрства цалкам спрацавала. Аналізуючы сітуацыю, я бачу гэта наступным чынам: калі ў 90-я гады можна было заявіць не сапсаваным рэкламай беларусам, што «мы банк нумар адзін» або «мы самая моцная страхавая кампанія» і г. д., то сёння гэта ўжо не працуе, і лабавую рэкламу трэба падмацоўваць іншым. Напрыклад, робячы добрую справу, праз якую людзі зразумеюць: о, вы клапоціцеся пра культуру, значыць, зацікаўленыя не толькі ў прыбытку, вам можна давяраць і прыемна супрацоўнічаць...



Адно з рабочых абмеркаванняў макета Берасцейскай Бібліі.

У спісе кніжнай спадчыны мы зрабілі таксама разбіўку па тэмах, бо ў кожнага патэнцыйнага інвестара свае інтарэсы: камусьці даспадобы ідэя падтрымаць навуковы праект, камусьці — вузкаспецыялізаваныя выданні, мастацкую літаратуру альбо рэлігійныя кнігі розных канфесій. З гэтага пераліку многае ўжо рэалізавана. Узяць хоць бы навуковыя працы: першыя падручнікі па айчыннай гісторыі, філалагічныя трактаты і «Граматыкі» (летась рэалізавалі вялікі праект па факсімільным узнаўленні першага ў свеце «Буквара»), альбо тое ж «Вялікае мастацтва артылерыі» Казіміра Семяновіча. За апошніе дзесяцігоддзе мы набылі і вярнулі ў Беларусь арыгіналы ўсіх першых выданняў гэтага твора, па якім уся Еўропа фактычна вучылася артылерыі і піратэхніцы — і выданне на лацінскай мове 1650 года ў цудоўным стане, і на французскай мове 1651-га, нямецкае, з дапаўненнямі, 1676-га, англійскае 1729-га... На розных аўкцыёнах знайшлі ўсе гэтыя асобнікі, і з дапамогай партнёраў зноў жа атрымалася іх набыць і вярнуць у Беларусь. Работа працягваецца — не скажу, каб штомесяц, але кожны год нам удаецца вярнуць «жыўцом» арыгіналы тых ці іншых беларускіх кніг. Ёсць яшчэ багата навуковых трактатаў, і падручнікаў, і літаратурных твораў выключнай значнасці. І я часта бачу, як загараюцца вочы ў школьнікаў, калі яны прыходзяць у бібліятэку і на ўласныя вочы бачаць, напрыклад, творы Францыска Скарыны ці Сімяона Полацкага, альбо нават творы пісьменнікаў пачатку XX стагоддзя ў арыгінале, з аўтографамі і пазнакамі аўтараў.

***— У 2016 годзе бібліятэка Кембрыджскага ўніверсітэта бясплатна перадала лічбавую копію аднаго з выданняў Скарыны ў Нацыянальную бібліятэку. Па сённяшнім часе гэта цуд. Ці часта ў вашай рабоце здараюцца такія цуды?***

— Яны здараюцца найчасцей як вынік сістэмнай працы людзей, пра якую мы не заўжды расказваем, — усміхаецца суразмоўнік. — У згаданым выпадку — вынік даволі працяглых перамоў, перапіскі, нашага супрацоўніцтва з кіраўніцтвам універсітэта і бібліятэкі... Насамрэч, на часе падрыхтоўкі і рэалізацыі мерапрыемстваў да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання мы атрымалі лічбавыя копіі выданняў Скарыны амаль з усяго свету, бо вельмі актыўна працавалі наўпрост з захавальнікамі (дзяржаўнымі ўстановамі і прыватнымі асобамі), і на сёння мы ведаем, колькі гэтых асобнікаў наогул існуе, дзе яны захоўваюцца і ў якім стане. Магу публічна абвясціць: у свеце захоўваецца 521 арыгінальнае выданне Скарыны — часам гэта старонка ці нават яе фрагмент, а часам — цэлая кніга, і каля паловы з іх мы маем у выглядзе лічбавых копій з бібліятэк, музеяў, архіваў і навуковых цэнтраў Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Польшчы, Германіі, Даніі, Вялікабрытаніі і г. д. Мабыць, упершыню за апошнія стагоддзі выданні Скарыны з Беларусі не вывозіліся, а прывозіліся — многія нам удалося паказаць тут у арыгінале, у Музеі кнігі. Недзе дамаўляліся на бясплатную алічбоўку ўладальнікамі, недзе рабілі за спонсарскія грошы, накіроўвалі сваіх спецыялістаў, альбо ладзілі абмен лічбавымі копіямі з рознымі краінамі.

***— Колькі чалавек, як правіла, працуе над факсімільным узнаўленнем таго ці іншага выдання?***

— Па-рознаму, ад некалькіх нашых супрацоўнікаў да вялікай міжнароднай каманды з дзясяткаў удзельнікаў. У любым выпадку, адзін чалавек такую працу не асіліць — усё адно далучаюцца дызайнеры, паліграфісты і іншыя спецыялісты. Самае меншае на праектах, да якіх я меў дачыненне, працавалі пяць чалавек. І гэта таксама вельмі добра, бо дазваляе спалучыць як рэтраспектыўны падыход кніжнікаў, так і сучасныя задачы дызайнераў, і камерцыйны аспект, і іміджавы.

***— Зусім хутка, падчас святкавання 1000-годдзя Брэста, будзе шырока прадстаўлена факсіміле Берасцейскай Бібліі. Вы кіравалі гэтым праектам і рабілі навуковае даследаванне. Штосьці новае для сябе адкрылі?***

— Здавалася б, гэты помнік шырока вядомы і павінен быць даследаваны цераз кожную старонку, але на здзяйсненне гэтага не было і дагэтуль няма. Нават для саміх берасцейцаў, можа, толькі апошнім часам адбываецца вяртанне Берасцейскай Бібліі ў грамадскую свядомасць. З'явілася сімвалічная скульптура перад уваходам у абласную бібліятэку, на айчынных тэатральных сцэнах ёсць пастаноўка «Біблія князя Радзівіла», праходзяць канферэнцыі, «Берасцейскія кнігазборы», распачатыя Алай Мяснянкінай — нястомнай руплівіцай, якая, на жаль, пайшла ўжо з жыцця, але якая абудзіла ў рэгіёне цікавасць да знакавага кніжнага помніка. Пакрысе з'яўляецца і сувенірная атрыбутыка — пано на сценкі, статуэткі, нейкія рэчы, якія перадаюць значэнне гэтай Бібліі як аднаго з сімвалаў горада над Бугам. Што да маіх уласных адкрыццяў, то падчас работы знайшоў пацвярджэнні, што нашы продкі былі не проста актыўнымі ўдзельнікамі, але і ініцыятарамі многіх культурных падзей таго часу. Берасцейская Біблія сведчыць пра наўпроставыя стасункі з еўрапейскімі інтэлектуаламі, напрыклад, з Жанам Кальвінам, які вельмі зацікавіўся перакладам і выданнем і накіроўваў сваіх калег сюды для ўдзелу ў праекце...

Яшчэ выявіў безліч памылак пра Берасцейскую Біблію. Адкрыйце артыкул Вікіпедыі — там шмат недакладнасцяў, пачынаючы ад памераў і аб'ёму кнігі (у ёй 1,5 тысячы старонак, а не 700) да яе зместу і мерканага тыражу. Такія звесткі трапілі нават у навуковыя манаграфіі і энцыклапедыі, і факсімільнае ўзнаўленне Берасцейскай Бібліі нарэшце дазволіць выправіць гэтыя памылкі.

***— Ці ёсць у вас кніга-мара, да ўзнаўлення якой хацелася б прычыніцца?***

— Такімі маглі б стаць і выданні Скарыны, і першы Буквар, і Берасцейская Біблія, але праекты спраўдзіліся раней, чым я паспеў аб іх памарыць. Натуральна, маю пэўныя мары і спадзяванні, але стаўлюся да іх прагматычна: будзе магчымасць — зраблю, не будзе — зробіць нехта іншы, так ці інакш, работа працягнецца.

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ і з архіва Алеся СУШЫ.**

**● Дарэчы**

## ПЯЦЬ ФАКТАЎ ПРА БЕРАСЦЕЙСКУЮ БІБЛІЮ

✓ Берасцейская Біблія — першы на беларускіх землях поўны пераклад тэксту Свяшчэннага Пісання на старапольскую мову.

✓ Кніга была настолькі дарагая, што некаторыя шляхціцы менавіта яе, а не грошы ці нерухомасць, перадавалі ў пасаг дочкам.

✓ Тут упершыню ў гісторыі айчыннага кнігадрукавання зроблены прадметны паказальнік, а таксама ўнікальны каляндар царкоўных службаў на кожны дзень года: якую частку Бібліі ў які дзень трэба чытаць.

✓ Па адной з версій, дзеці канцлера ВКЛ Мікалая Радзівіла Чорнага з рэлігійных перакананняў знішчылі працу бацькі — публічна спалілі ўсе знойдзеныя экзэмпляры Берасцейскай Бібліі. Аднак даследчыкі прыйшлі да высновы, што гэта міф.

✓ Кошт факсімільнага ўзнаўлення выдання, рэалізаванага ў дзяржаўна-прыватным партнёрстве, склаў каля 10 тысяч еўра (выдадзены 11 асобнікаў). У Нацыянальнай бібліятэцы гатовыя дадрукоўваць кнігу далей па замовах — кошт самага дарагога фаліянта ў скуранной вокладцы і з багатай фурнітурай ацэньваюць прыкладна ў 3,5 тысячы беларускіх рублёў.




## ТРЭБА СЛУХАЦЬ ЖОНКУ

...Дзядзька Мар'ян у той дзень, што называецца, захаўтурыў: на ўласным трактарку прывёз суседу бульбы. Разам яны разгрузілі мяшкі, разам селі за стол: гавораць, частуюцца — хораша сядзяць, бо яно ж чарку браць — не гной выкідаць...

Адзінае — выпіўкі мала, а болей гаспадыня і грама не дае, на сваім стаіць: маўляў, выпілі і досыць, бо ты, Мар'янка, на трактары... І табе, гаспадар, пара аглядацца — свінні стаяць галодныя.

Але ж Юзіку, калі той пад мухай, ужо не да свіней і тым больш не да жонкі, бо калі яе слухаць...

Карацей, перамігнуліся яны з дзядзькам Мар'янам і ўдвух патэпалі з хаты на вуліцу. Там па чарзе ўскараскаліся на дзядзькаў трактарок ды «панесліся» ў найбліжэйшую краму.

Ехалі, віхляючы, дарогай палявой, потым неяк «ускочылі» (не прамахнуліся!) на вузкаваты масток цераз рэчку. А вось на ім, ужо крышачку збочыўшы, трактарок... не ўтрымаўся — паволі занурыў у ваду.

Першым з яе вынырнуў маладзейшы — Юзік:

— Гэ-эй, Мар'ян, — клікнуў ён суседа, — ты дзе?

Ніхто не адазваўся, таму спалоханы Юзік зноў сігануў пад трактар.

У гэты ж час, але з другога боку, паказалася галава Мар'яна:

— Юзі-ік, ты дзе?! — загалёкаў ён і, набраўшы паветра, вярнуўся ў ваду... З якой тут жа (і зноў жа з іншага боку) з'явілася галава суседа.

— Мар'ян! Ты жывы? — загалёкаў ён і, яшчэ раз з ім «размінуўшыся», пагрузіўся ў рэчку...

Выплыў, шалёна хапаючы паветра, ужо ля берага, выскачыў з вады і з крыкам: «Людзі, ратуйце!..» панёсся да вёскі.

У гэты ж час, не знайшоўшы суседа ні ў вадзе, ні на беразе, дзядзька Мар'ян ужо горка выў:

— Во-о-о... Даба-айві-і-і... У-у-уто-оп!!! І што ж зараз будзе-е? Што мне ўдаве Юзевай сказаць? Лю-дзі!..

Яны, скліканыя «тапельцам», тым часам ужо беглі да рэчкі — не тое ратаваць, не тое гараваць па Мар'яне, і «агучвала» гэтую «працэсію» жонка Юзі:

— Во што нарабіла праклятая гарэлка! — крыкма крычала яна. — Ды хай бы я тую бульбу на гарбе сваім панасіла-а! На халеру мне быў яго трактар?!

Гэтыя два галасы імкліва ішлі на збліжэнне і ўрэшце...

Юзік з Мар'янам — абодва мокрыя і жывыя! — моцна абняліся, нават, казалі, заплакалі...

Ці кінулі потым піць?

Хацелася б сказаць: «Ну вядома ж!», але...

**Зыгмунд Дзякевіч,**
*в. Пенцेнішкі, Воранаўскі раён.*

## СІЛА РЭКЛАМЫ

Гэтых трох мужчын-пенсіянераў аб'яднала адзінота. Аўдавелі яны хто раней, хто пазней і ўдары лёсу прынялі па-рознаму. Іван, напрыклад, вырашыў, што болей жаніцца не будзе, і без жонкі не прападзе. Можа, хоць начытаецца: пасля вайны не было калі, скончыў толькі пяць класаў. А далей трэба было працаваць. Паслухаўся маці, пайшоў у калгас, але ж на кніжкі «падсеў». Чытаў усё, што траплялася: газеты, часопісы, розныя даведнікі. Жонка, нябожчыца, аж шалела, бачачы гаспадара за чытвом...

А вось прыяцелі яго, Васіль ды Міхась, «без баб сваіх» зусім не маглі. Разгуляліся, распіліся яны, як той казаў, на сабачую пугу. Дзяцей ды ўнукаў ад сябе адвадзілі, бо каму ж спадабаецца прыязджаць да такіх вось бацькаў: дамы ў іх брудам зараслі, гаспадаркі звяліся, гароды запушчаны...

У Івана ж усё чын чынам было: поўны падворак курэй, сабака з катом, у гародзе і бульбачка, і капуста з буракамі...

Хіба з цыбуляй першы год непрыемнасць выйшла. Нейкі баламут на рынку насенне прадаваў (галоўнае — зусім нядорага!), казаў, што пасадзіць трэба ўвосень, тады ранні вітамін будзе ледзь не з-пад снегу.

Іван аж тры місачкі ўзяў, як след рассадзіў... І града вясной сапраўды аддзячыла: закрасавала... Цюльпанамі.

Адным словам, Іван (з тых часоў яшчэ і Цюльпан) па-людску жыў і шмат каму жыць памагаў. Сябрам па няшчасці, Васілю з Міхасём, і пагатоў, бо яны часцяком канцы з канцамі не зводзілі, без капейкі заставаліся. Праўда, паўтаралася гэта ці не кожны месяц. А таму цярпенне ў крэдытора ўрэшце лопнула.

— Вось што, — сказаў аднойчы, — я вам не маці Тэрэза. Сваіх мазгоў не маеце, не ўмееце грошы размеркаваць, дык жаніцеся. Вунь Марыля адна, і Таццяна аўдавела... Наперад!

Дружбакі паслухалі яго — схадзілі ў «разведку». І вярнуліся ні з чым, бо жанчыны ведалі гэтых выпівох як аблупленых: не захацелі такога «шчасця».
| **Предмет торгов** |
|---|
| «технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники» с инв. № в ЕГРНИ 600/С-162566 общей площадью 9 270,6 кв. м (**назначение:** сооружение специализированное складов, хранилищ; **составные части и принадлежности:** технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники – литер А, состоящая из подъезда, трех покрытий, трех бортов, технологической площадки, дорожки, ограждения) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,6243 га, кадастровый номер – 623650100001005212 |
| Местонахождение – Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17 |
| Начальная цена – 1 311 841,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 131 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.
**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы: заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», 220035, г. Минск, пр-т Машерова, 80, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (покупатель) обязуется в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукционных торгов возместить организатору торгов затраты за организацию и проведение аукциона. Информация о сумме затрат за организацию и проведение аукциона, подлежащих возмещению, доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы затрат за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 19 сентября 2019 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 02.09.2019 по 17.09.2019 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону: (017) 388-43-58.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-63-93, 388-43-58 (ОАО «ДСТ № 5»).

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** У панядзелак падвядзіце вынікі і прааналізуйце змены, якія адбываюцца ў жыцці. Серада — удалы дзень для раскрыцця сваіх здольнасцяў. У чацвер вам увесь дзень будзе спадарожнічаць добры настрой, можна смела ўвасабляць у жыццё самыя авантурныя планы, не асцерагаючыся ўскладненняў. У суботу будзьце асцярожныя, не верце лісілівым словам і кампліментам.

**ЦЯЛЕЦ.** Дзелавая паездка можа адкрыць новыя перспектывы. Ёсць шанц, што поспех усміхнецца вам, таксама магчымы ўзлёт па кар'ернай лесвіцы. Рызыкоўныя прадпрыемствы завершацца паспяхова ў тым выпадку, калі вы правільна размеркуеце свае сілы, і не будзеце ўскладаць вялікія надзеі на чыюсьці дапамогу. Рабіце сваю справу і дайце іншым займацца сваімі пытаннямі.

**БЛІЗНЯТЫ.** Інтуіцыя прынясе вам поспех, толькі не губляйце яе якасцяў, як рашучасць і сабранасць. Прывабная прапанова можа паступіць ад старога сябра. Не бойцеся ўзяць на сябе адказнасць, і выйграеце. Прызначаная на сярэдзіну тыдня паездка пройдзе вельмі плённа і пацешыць. Надыходзіць спрыяльны момант для сур'ёзнага жыццёвага выбару.

**РАК.** Можа спатрэбіцца філасофскі погляд на праблемы і ўменне трымаць сябе ў руках у любых сітуацыях. Затое вас чакае поспех у прафесійнай сферы. Аўторак абяцае стаць днём актыўных узаемаадносін і ўзаемаразумення, з дапамогай слоў і логікі зможаце дамагчыся ад свайго партнёра практычна ўсяго.

**ЛЕЎ.** Інтуіцыя — ваш верны і надзейны сябар на гэтым тыдні. Варта навучыцца ёй давяраць, па меншай меры — на гэты перыяд. Магчымы ўдзел у якіх-небудзь новых праектах. Аднак не плануйце залішняй перагрузкі на рабоце, прысвяціце час распрацоўцы планаў на найбліжэйшы час. Не фарсіруйце падзеі і не спрабуйце рабіць дзесяць спраў адначасова. У сераду можа здацца, што вы адчуваеце зацішша перад бурай. Цалкам магчыма, што так яно і ёсць, назапашвайце сілы і супакойцеся, каб лягчэй было трымаць сябе ў руках, калі яна прыйдзе.

**ДЗЕВА.** Неабходна паказаць сябе, ды так, каб вас заўважылі і падтрымалі тыя, ад каго вы маглі б атрымаць дапамогу ў найбліжэйшы час. У панядзелак не саромейцеся пры выпадку карэктна падкрэсліць вашу незаменнасць на рабоце. У сераду не маўчыце сціпла, кантактуйце, вам будзе патрэбна інфармацыя, а выдатны спосаб яе атрымаць — шчыра пагаварыць з калегамі. У чацвер не варта планаваць нічога сур'ёзна, лепш разбярыцеся з няскончанымі дробнымі справамі.

**ШАЛІ.** На гэтым тыдні ў вас можа ўзнікнуць патрэба пачаць будаваць адносіны ці кар'еру наноў, разбурыўшы тое, што надакучыла і замінае. Аднак не варта неадкладна ўвасабляць новыя ідэі, вы павінны спачатку ўсё добра асэнсаваць і прадумаць наступствы. Будучыня мае некалькі туманныя абрысы, што не можа не выклікаць у вас пэўную разгубленасць. Але калі не працаваць над яе назіраннем, яна пакіне горкае расчараванне нездзейсненых надзей і страчаных магчымасцяў.

**СКАРПІЁН.** Тыдзень прынясе новыя жыццёвыя ўстаноўкі. Старайцеся не марнаваць каштоўны час. Усё задуманае зможа здзейсніцца, калі вы спакойна і выразна будзеце рабіць сваю справу. У другой палове тыдня можаце адчуць, што на многае здольныя, адчуеце прыліў энергіі. Паспрабуйце стварыць камфортную абстаноўку і выканаць жаданні каханага чалавека.

**СТРАЛЕЦ.** Першая палова тыдня добрая для рэалізацыі планаў і дасягнення пастаўленых мэт. Але не ўздумайце спяшацца, калі ўсё намечанае будзе зроблена. Адпачніце пазней, а час, які застаўся, лепш выкарыстоўвайце для вырашэння яшчэ пары-тройкі задач. Бо менавіта зараз у вас ёсць сілы і азарт. На выхадныя пажадана не планаваць важных спраў.

**КАЗЯРОГ.** Не замахвайцеся на глабальныя праекты, звярніце ўвагу на значныя дробязі. Надыходзіць спрыяльны момант для вырашэння назапашаных праблем. Паспрабуйце пазбягаць крайнасцяў і эмацыянальных усплёскаў, інакш у пачатку тыдня могуць паўстаць нечаканыя праблемы ў сям'і. Будзьце ўважлівыя і асцярожныя пры рабоце з дакументамі і дамовамі. У пятніцу адбудуцца падзеі, якія адкрыюць новыя магчымасці ў прафесіі.

**ВАДАЛІЎ.** Тыдзень можа пачацца з прыемных сюрпрызаў, калі патэлефануе сябар, з якім вы даўно не размаўлялі. Выкарыстоўвайце адпачынак для змены абстаноўкі, адцягніцеся ад спраў і клопатаў, яны могуць пачакаць. Найбольш спрыяльным днём на гэтым тыдні для вас будзе пятніца.

**РЫБЫ.** Калі будзеце празмерна клапаціцца пра ментальны камфорт і дабрабыт, то можаце прынесці ў ахвяру рэалізацыю вельмі цікавых і перспектыўных планаў. Прыслухайцеся да парад навакольных, некаторыя з іх лепш прыняць на ўзбраенне. На гэтым тыдні ў вас можа з'явіцца шанц змяніць работу. Не бойцеся спрабаваць, памыляцца, пачынаць штосьці новае.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.13 | 20.06 | 13.53 |
| Віцебск — | 6.00 | 19.58 | 13.58 |
| Магілёў — | 6.03 | 19.56 | 13.53 |
| Гомель — | 6.03 | 19.50 | 13.47 |
| Гродна — | 6.29 | 20.20 | 13.51 |
| Брэст — | 6.33 | 20.18 | 13.45 |

### Месяц

*Маладзік ў 13.36.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

### Імяніны

*Пр.* Ульяны, Аляксея, Куприяна, Мірона, Паўла, Піліпа.
*К.* Маргарыты, Ружы, Міхала, Фелікса.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 30 ЖНІЎНЯ




**1753** год — пры Віленскім універсітэце была створана Віленская астранамічная абсерваторыя. Гэта адна з самых старых астранамічных абсерваторый у Еўропе. Адным з арганізатараў і першым дырэктарам яе (1765—1807) быў М. Пачобут-Адляніцкі. Пасля набыцця больш сучасных астранамічных інструментаў з 1773 года тут праводзіліся сістэматычныя назіранні планет, астэроідаў, камет, зацьменняў Сонца і Месяца, пакрыццяў зорак Месяцам. Першая ў Расіі пачала астрафізічныя даследаванні.

**1804** год — нарадзіўся (мястэчка Крывічы, цяпер у Мядзельскім раёне) Аляксандр Ходзька, беларускі паэт, фалькларыст, славіст, усходазнавец. У 1825 годзе скончыў Віленскі ўніверсітэт, у 1829-м — аддзяленне жывых моў пры Азіяцкім дэпартаменце МЗС у Пецярбургу. З 1831 годзе на дыпламатычнай службе ў Персіі, затым у Парыжы. Папулярызаваў славянскія мовы, фальклор. У 1829 годзе выдаў зборнік «Паэзія», некаторыя балады якога заснаваныя на беларускім фальклоры. Падрыхтаваў працу аб помніках стараславянскага пісьменства, размоўнік турэцкай мовы, напісаў даследаванне па курдскай мове. Памёр у 1891 годзе.

**1880** год — у Мінску заснаваны гурток тайнай рэвалюцыйнай арганізацыі «Народная воля», дзейнічаў да 1889 года.

**1913** год — старшыня Мінскага спартыўнага таварыства «Санітас» А. Александровіч, В. Сакадынскі і яшчэ пяцёра мінскіх атлетаў прынялі ўдзел у 1-й Усерасійскай алімпіядзе, якая адкрылася ў Кіеве.

**1933** год — органы АДПУ БССР правялі арышты па справе званай «контррэвалюцыйнай паўстанцкай і шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі «Беларускі нацыянальны цэнтр» на чале з С. Ракам-Міхайлоўскім, І. Дварчаніным, П. Мятлой і іншымі. Арышту падвергся 161 адказны работнік дзяржаўных, партыйных, навуковых і іншых устаноў, большасць з іх было накіравана ў ссылкі на Салаўкі і ў Комі АССР, 22 чалавекі расстраляныя ў 1934 годзе. У 1956 годзе справа «БНЦ» спынена з-за адсутнасці саставу злачынства.




**1721** год — падпісаны Ніштадскі мірны дагавор Расіі са Швецыяй, якім закончылася Паўночная вайна 1700—1721 гадоў. Расія атрымала правы на Ліфляндыю, Эстонію, іншыя прыбалтыйскія землі. Абавязалася выплаціць Швецыі грашовую кампенсацыю і вярнуць Фінляндыю.

**1860** год — нарадзіўся Ісак Ільіч Левітан, славуты рускі жывапісец-пейзажыст, перасоўнік. З 1898 года выкладаў у Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства. Працаваў у Крыме, на Волзе, у Фінляндыі, Італіі, Францыі, Швейцарыі. Майстар камернага, лірычнага пейзажа, так званага пейзажа настрою. Яго называлі песняром рускай прыроды. Сярод твораў: карціны «Пасля дажджу», «Вячэрні звон», «Залатая восень» і іншыя. Большасць карцін мастака знаходзіцца ў Траццякоўскай галерэі. Памёр у 1900 годзе.



## УСМІХНЕМСЯ

Лета — яно як піва. Здавалася шмат брала, і яно — бац, і скончылася...

**— Коцік, а ты секс будзеш? — клапатліва спытала яна.**
**І Коцік зразумеў: баршчу не будзе.**

Марская хвароба, гэта калі сядзжу я за тысячы кіламетраў ад мора і мне дрэнна...

**— Мікіта, пойдзем у саўну?**
**— Мне нельга...**
**— Што, ціск? Ці жонка?**
**— Цiск з боку жонкі.**

Загадка: 30 гадоў — розуму няма.
Адгадка: ты ў 30 гадоў.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2802.
Нумар падпісаны ў 19.30 29 жніўня 2019 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

30 жніўня 2019 г. № 35 (520)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### На адной мове



Як прыцягнуць бізнес у правіншыю? стар. 2

### Наваселле ў Астраўцы



Арыгінальны цэнтр творчасці дзяцей і моладзі з'явіўся ў горадзе атамшчыкаў. стар. 3

### Установа будучага



Рыхтуецца да адкрыцця ў Магілёве. стар. 4, 13

### Гульні з наступствамі



Хто павінен несці адказнасць за стан арэляў, каруселяў і горак у двары? стар. 15

### Гаджэт з рук!



Як прадухіліць развіццё школьна-залежных захворванняў. стар. 16


ТЭМА ТЫДНЯ

# НА ДАРОЗЕ, У ШКОЛЕ, ДОМА...



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## Хто клапоціцца пра бяспеку дзяцей?

**Да першага верасня рыхтуюцца не толькі школы. Цяжка нават падлічыць, якая колькасць людзей у гэты час задзейнічана ў розных прафілактычных мерапрыемствах, каб гарантаваць бяспеку хлопчыкаў і дзяўчынак, захаваць іх жыццё і здароўе. Пад нагляд вучні трапляюць ужо з таго моманту, як пакідаюць дом, каб выправіцца ў школу.**

### КАЛІ ВУЧНІ ДАБІРАЮЦЦА НА ЗАНЯТКІ...

Супрацоўнікі праваахоўных органаў паклапаціліся пра тое, каб дзеткі, якіх бацькі падвозяць да навучальных устаноў, не патрапілі ў бяду. Так, рэспубліканская прафілактычная акцыя «Маленькі пасажыр — вялікая адказнасць» скіравана на бацькоў-кіроўцаў, якія абавязаны забяспечыць бяспечную перавозку дзяцей. «Норма пра выкарыстанне дзіцячых утрымальных прыстасаванняў, нягледзячы на тое, што яна ўжо дзейнічае больш за два гады, так і не стала аксіёмай. З 15 дзетак, якія загінулі за бягучыя сем месяцаў, дзевяць з'яўляліся пасажырамі транспартных сродкаў. З 76 параненых юных пасажыраў практычна кожнае другое дзіця перавозілася з парушэннем правілаў», — паведаміла **старшы інспектар па асобых даручэннях аддзела арганізацыі міжведамаснага ўзаемадзеяння і прапаганды бяспекі дарожнага руху ўпраўлення Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Ганна БАНАДЫК.**

стар. 3

ВЫБАРЫ-2019

# БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ... КАНДЫДАТАМ

### Адна з галоўных задач камісій на месцах — праверка пададзеных звестак

Акруговыя выбарчыя камісіі пры праверцы звестак, якія ўтрымліваюцца ў дэкларацыі кандыдата, накіроўваюць адпаведны запыт у дзяржаўныя органы і арганізацыі, што валодаюць адпаведнай інфармацыяй, — падатковыя органы, Дэпартамент па каштоўных паперах, Нацыянальнае кадастравае агенцтва і гэтак далей. Пра гэта паведаміла на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў **загадчык аддзела прававой, аналітычнай і метадычнай работы апарату Цэнтральнай камісіі Галіна МКРТЫЧАН.**

Адпаведная пастанова, зацверджаная на пасяджэнні, дае і формы запытаў акруговых камісій. Заканадаўства прадугледжвае трохдзённы тэрмін для адказу камісіям па запытанай інфармацыі. Калі арганізацыя не можа даць неабходныя даныя цягам трох дзён, яна павінна праінфармаваць камісію і прадставіць звесткі пазней. У любым выпадку камісіі атрымаюць адказы з такім разлікам, каб паспець разгледзець пытанне аб рэгістрацыі кандыдата.

Камісія можа адмовіць у рэгістрацыі, калі ўказаны звесткі, якія не адпавядаюць рэчаіснасці, істотнага характару. Напрыклад, калі агульная сума даходу заніжана на дваццаць працэнтаў альбо адсутнічаюць звесткі аб уласнай нерухомай маёмасці, транспартным сродку, аб акцыях ці ўказаны ў меншым памеры.

Галіна Мкртычан нагадала, што акруговая камісія не мае права адмовіць у рэгістрацыі, калі не паказаны звесткі аб даходах у выглядзе аплаты кошту пуцёвак, курсовак, атрыманых ад прафсаюзных і іншых арганізацый іх членамі; адсутнічаюць звесткі аб аднаразовай дапамозе, якую арганізацыя аказала свайму работніку; адсутнічаюць звесткі аб атрыманай кампенсацыі расходаў на вучэбна-метадычную літаратуру.

Не можа стаць прычынай для адмовы і ўказанне ў дэкларацыі звестак, якія не адпавядаюць рэчаіснасці, аб даходах у меншым памеры, альбо ўказанне аб даходах і колькасці акцый у большым памеры.

Закон прадугледжвае два спосабы інфармавання: у сродках масавай інфармацыі адначасова з паведамленнем аб рэгістрацыі кандыдата альбо ў агульных інфармацыйных плакатах з біяграфічнымі данымі кандыдатаў. Выбар спосабу вызначаецца рашэннем акруговай выбарчай камісіі.

Дэклараванне даходаў і маёмасці кандыдатаў павышае ступень інфармаванасці выбаршчыкаў аб прэтэндэнтах на выбарную пасаду: жыхары акругі атрымліваюць звесткі аб агульнай суме гадавога даходу і аб маёмасці кожнага з зарэгістраваных кандыдатаў, адзначыла Галіна Мкртычан.

**Варвара МАРОЗАВА.**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Беларуска-індыйская праграма для смартфона

*У Савеце Рэспублікі абмеркавалі перспектывы супрацоўніцтва з індыйскай фармацэўтычнай карпарацыяй*

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ сустрэўся з прадстаўнікамі індыйскай кампаніі Biocon Limited на чале са старшым віцэ-прэзідэнтам Аляксандрам ЗАХАМ, паведамляе прэс-служба верхняй палаты беларускага парламента.**

Развіццё фармацэўтычнай прамысловасці — адзін з прыярытэтаў для Рэспублікі Беларусь, падкрэсліў Сяргей Рахманаў. На яго думку, у краіне ёсць неабходны вытворчы і інтэлектуальны патэнцыял для паспяховага развіцця супрацоўніцтва з індыйскімі кампаніямі. «І гаворка ідзе не толькі аб імпарце і экспарце, але і прамысловай кааперацыі, стварэнні сумесных вытворчасцяў і нават кластараў, якія аб'ядналі б прадстаўнікоў бізнесу, навукі і адукацыі. Сумесна мы маглі б працаваць і на рынках трэціх краін», — прапанаваў ён.

Асаблівую ўвагу старшыня Пастаяннай камісіі ўдзяліў назапашанаму ў Беларусі вопыту ў сферах IT і высокіх тэхналогій. Гатыя веды і тэхналогіі могуць працаваць і на фармацэўтычную галіну, падкрэсліў ён. З гэтым пагадзіліся і прадстаўнікі Biocon Limited. У свеце сёння запатрабавана такога роду прадукты. У якасці прыкладу яны прывялі праект па распрацоўцы мабільнай праграмы для аўтаматызаванага кантролю стану здароўя інсулінazалежных людзей. «Нам цікавыя падобныя праекты, таму мы з радасцю гатовыя абмеркаваць прапановы беларускага боку, у тым ліку па развіцці мабільных тэхналогій», — заявіў Аляксандр Зах.

У якасці перспектыўнага кірунку ўзаемадзеяння пазначаная таксама трансплантaлогія. Беларускія трансплантолагі ўжо наведвалі Індыю для абмену вопытам са сваімі замежнымі калегамі. У будучыні гэта супрацоўніцтва можа быць пашыранае.

У час перагавораў бакі ўдзялілі ўвагу пытанням трансферу ў Беларусь індыйскіх тэхналогій па вытворчасці лекавых прэпаратаў для лячэння анкалагічных захворванняў і цукровага дыябету. Размова таксама ішла аб арганізацыі абмену спецыялістамі.

Biocon Limited — вядучая індыйская біятэхналагічная кампанія, якая вырабляе актыўныя фармсубстанцыі і гатовыя лекавыя сродкі ў такіх тэрапеўтычных сегментах, як дыябеталогія, анкалогія, нефралогія, кардыялогія. Акрамя вытворчай дзейнасці, кампанія займаецца даклінічнымі і клінічнымі даследаваннямі прадуктаў, якія вырабляюцца, і іх дыстрыбуцыяй на сусветным рынку. Прэпараты Biocon Limited пастаўляюцца больш чым у 70 краін свету.

# Культурная спадчына — агульны клопат

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Кацярына ДУЛАВА ў якасці ганаровага замежнага госця ўзяла ўдзел у цырымоніі ўрачыстага адкрыцця XII Міжнароднага музычнага фестывалю «Шарк тароналары» («Мелодыі ўсходу») у горадзе Самаркандзе (Рэспубліка Узбекістан).**

Маштабны музычны форум ва Узбекістане праходзіць на рэгулярнай аснове раз на два гады з 1997 года. Заяўленымі мэтамі і задачамі фестывалю з'яўляецца шырокая папулярызацыя, захаванне і развіццё найлепшых дасягненняў нацыянальнага музычнага мастацтва; выхаванне маладога пакалення ў духу пераемнасці нацыянальных традыцый; далейшае пашырэнне міжнародных творчых сувязяў. Арганізатарамі мерапрыемства выступаюць Міністэрства культуры і спорту Рэспублікі Узбекістан, Нацыянальная тэлерадыёкампанія Узбекістана, Саюз кампазітараў Узбекістана і хакімiят (адміністрацыя) Самаркандскай вобласці. Конкурс праводзіцца пры падтрымцы ЮНЕСКА.

Сёлета фестываль сабраў 340 артыстаў з 75 краін.

У цырымоніі адкрыцця фестывалю бралі ўдзел прэзідэнт Рэспублікі Узбекістан Шаўкат Мірзіёеў, генеральны дырэктар ЮНЕСКА Одры Азуле, афіцыйныя асобы і ганаровыя госці з Выканаўчага камітэта СНД, Расіі, Казахстана, Кыргызстана, Таджыкістана, Туркменістана, Бангладэш, Польшчы, Японіі, Паўднёвай Карэі, Вялікабрытаніі і іншых краін.

Беларускі сенатар у рамках рабочага візіту ў Рэспубліку Узбекістан таксама ўдзельнічала ў міжнароднай канферэнцыі «Захаванне матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны: бягучыя праблемы і стратэгіі іх рашэння», якая праходзіла ў Палацы форумаў Самарканда. Парламентарый падчас культурнай праграмы фестывалю наведала помнікі ЮНЕСКА і дала інтэрв'ю для дзяржаўных СМІ Рэспублікі Узбекістан па пытаннях захавання культурнай спадчыны.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# КРОКІ НАПЕРАД БЕЗ КРОКАЎ НАЗАД

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ прыняў удзел у пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, на якім былі разгледжаны комплексны план развіцця адстаючых рэгіёнаў Беларусі.**


Фота БелТА.

Дакумент падрыхтаваны Міністэрствам эканомікі сумесна з аблвыканкамамі, ён датычыцца 31 рэгіёна нашай краіны, якія адстаюць па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця.

«Асноўная задача — падцягнуць адстаючыя рэгіёны да сярэднерэспубліканскага ўзроўню. Гэта задача няпростая. Трэба стварыць умовы не толькі для рэальнага сектара, але і для прыцягнення працоўных рэсурсаў, зніжэння адтоку насельніцтва за кошт стварэння камфортных умоў для жыцця», — заявіў **прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС.**

Рабочая назва дакумента — план індустрыялізацыі адстаючых у развіцці рэгіёнаў, паведамляе прэс-служба Савета Міністраў. Аднак кіраўнік урада лічыць, што больш правільна казаць аб плане не індустрыялізацыі, а развіцця. «Бо развіццё тэрыторый можа быць звязана не толькі з прамысловасцю, але і са сферай паслуг, у прыватнасці з турызмам, што вельмі актуальна для адсталых рэгіёнаў», — растлумачыў ён.

У выніку выканання плана з групы адстаючых павінны выйсці 11 рэгіёнаў, яшчэ пяць — ушчыльную наблізіцца да выхаду з яе.

**Міністр эканомікі Беларусі Дзмітрый КРУТОЙ** паведаміў, што ў плане развіцця мяркуецца ўключыць дастаткова шмат праектаў.

«На сённяшні дзень сфарміраваны пакет з 280 праектаў. Прыкладна 54 праекты будуць створаны з нуля, каля 80 — гэта інвестыцыі ў дзеючыя вытворчасці і 140 праектаў адносяцца да сферы інфраструктуры (каля 30 працэнтаў — прамысловая інфраструктура, астатняе — сацыяльныя аб'екты)», — расказаў ён.

Мінэканомікі мяркуе, што аб'ём інвестыцый, а, адпаведна, і ўсе астатнія паказчыкі (выручка на аднаго занятага, узровень заработнай платы) будуць расці вышэй, чым у сярэднім па абласцях, дзе гэтыя раёны размешчаны.

Па словах міністра, умовы для інвестараў у гэтых адстаючых рэгіёнах — адно з самых дыскусійных пытанняў. «Калі паглядзець цвяроза, то можна сказаць, што ўвесь пакет прэферэнцый там ужо дзейнічае. Усе раёны падпадаюць пад дзеянне Дэкрэта № 6 па малых гарадах і сельскай мясцовасці, там свой аб'ём падатковых льгот. Частка раёнаў мае ўчасткі свабодных эканамічных зон, і там будуць рэалізоўвацца праекты, гэта якраз патрабаванне Прэзідэнта, мы ўвесь раён не зможам абвясціць СЭЗ, імі будуць аб'яўляцца канкрэтныя вытворчыя пляцоўкі, куды прыйдуць у першую чаргу прамысловыя прадпрыемствы», — растлумачыў Дзмітрый Крутой.

Паводле яго слоў, больш за 90 працэнтаў праектаў прафінансуюць беларускія інвестары. Астатняе возьмуць на сябе замежныя інвестары, а таксама міжнародныя фінансавыя арганізацыі, якія накіроўваюць сродкі ў першую чаргу на развіццё інфраструктуры, напрыклад, будаўніцтва станцый абезжалезвання вады ці перавод кацельняў на мясцовыя віды паліва, развіццё альтэрнатыўных відаў энергетыкі. Сродкі Сусветнага банка будуць выкарыстоўваца для рамонту школ і бальніц.

План развіцця адсталых рэгіёнаў плануецца зацвердзіць пастановай Саўміна. Яго выкананне будуць маніторыць аблвыканкамы сумесна з урадам.

Акрамя 280 праектаў ёсць яшчэ 224 інвестыцыйныя прапановы. Гэта, па сутнасці, бізнес-ідэі, якія неабходна адпрацоўваць з зацікаўленымі, вызначаць крыніцы фінансавання і тэрміны. Гэта патэнцыйны пул інвестыцый, якія павялічаць эканоміку гэтых раёнаў, сказаў міністр.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

ЭКАНОМІКА І РЭГІЁНЫ

# Размаўляць на адной мове

**Як прыцягнуць бізнес у правінцыю?**

**У Віцебскай вобласці прыкладна чвэрць паступленняў падаткаў у бюджэт — ад суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу. Ёсць і свае перадавікі, у якіх можна вучыцца: у Талачынскім, Шумілінскім і Пастаўскім раёнах прадстаўнікі бізнесу напаўняюць бюджэт больш чым напалову!**

**Летась актыўнасць бізнесу ў экспарце тавараў — 52,6 %, паслуг — каля 51 %, у дабаўленую вартасць — 19 %.**

На жаль, кардынальна сітуацыя за апошнія гады не змянілася — нахонт таго, каб у разы павялічвалася колькасць дзелавых людзей, адпаведна рос бы іх уклад у эканоміку краіны.

Кіраўніцтва Віцебскага аблвыканкама лічыць, што трэба актывізаваць работу па прыцягненні інвестараў і на новым узроўні супрацоўнічаць з тымі, хто ўжо будуе свой бізнес у рэгіёне. Трэба адыходзіць ад практыкі чакання прапаноў і самастойна рэкламаваць патэнцыйную выгаду ад набыцці аб'ектаў нерухомасці, якія пустуюць.

Між іншым, пры кожным райвыканкаме створаны адмысловыя саветы, мэта якіх спрыяць развіццю прадпрымальніцтва. Кіраўнік рэгіёна патрабуе, каб яны дзейнічалі нефармальна. Дзелавыя людзі павінны адчуваць сабе часткай каманды.

**Губернатар Мікалай ШАРСНЁЎ** на нядаўнім пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама выказаў незадаволенасць тым, што бізнесмены і чыноўнікі «размаўляюць на розных мовах». Чарговы раз нагадаў, што, калі бізнес вельмі развіты, можна параўнальна лягчэй вырашаць розныя сацыяльныя задачы.

У Беларусі, нават замежныя эксперты з развітых краін гэта прызнаюць, вельмі прывабныя ўмовы для вядзення бізнесу. А некаторыя магчымасці наогул унікальныя. Напрыклад, у Аршанскім раёне падаткі вельмі сімвалічныя, але чаргі з ліку тых, хто хоча там зарэгістраваць сваю справу, няма. Як і, напрыклад, нямнога пажадалі будаваць гатэлі, цэнтры здароўя ў месцах з цудоўнай прыродай, недалёка ад азёраў. Старшыня аблвыканкама нагадаў, што кіраўнік дзяржавы пайшоў насустрач і надзяліў старшынь райвыканкамаў правамі вылучэння «запаветных участкаў». Аднак жа за два гады толькі пяць участкаў сталі запатрабаванымі.

Па словах **першага намесніка старшыні камітэта эканомікі аблвыканкама Аляксандра КАСЦЮКОВА,** па стане на 1 ліпеня, у вобласці 30 813 суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. У іх ліку каля 22,2 тысячы індывідуальных прадпрымальнікаў. Што цікава: да ўзроўню мінулага года колькасць юрыдычных асоб паменшылася на 66, а ІП стала больш — на 691.

Вельмі добрая тэндэнцыя: людзі, якія страцілі работу, цяпер больш актыўна спрабуюць сябе ў ролі «працуючага на самога сябе, а не на чужога дзядзьку». Толькі летась для арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці з ліку сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва аказана фінансавая падтрымка 215 беспрацоўным. Яны атрымалі 572,1 тысячы рублёў. А сёлета, у першым паўгоддзі, — каля 85 грамадзян такім жа чынам атрымалі 250,1 тысячы рублёў. Каб павышаць фінансавую адукаванасць, для беспрацоўных праводзяць курсы асноў бізнес-планавання.

Што датычыцца інфраструктуры падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, у Віцебскай вобласці створана восем спецыялізаваных цэнтраў. Таксама даволі эфектыўна дзейнічаюць тры інкубатары малога прадпрымальніцтва — у Оршы, Полацку і Віцебску.

Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў фірмаў летась склала 693,5 рубля. І гэта, дарэчы, на 18,9 % больш, чым у 2017 годзе. Зразумела, што сталі плаціць больш грошай, бо сталі працаваць больш эфектыўна. У прыватнасці, гадавая выручка на аднаго работніка да пазалеташняга ўзроўню вырасла на 21,2 % і склала 89,6 тысячы рублёў.

Пра неабходнасць таго, каб кіраўнікі прадстаўнічай улады спрыялі развіццю бізнесу, пастаянна нагадвае і **старшыня абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ.** Вельмі эфектыўная і практыка правядзення выязных пасяджэнняў у рэгіёнах, падчас якіх старшыні райсаветаў могуць убачыць, як кінутыя гадамі будынкі выкарыстоўваюць у якасці кафэ, крамаў, майстэрняў, цэхаў міні-вытворчасці. Вельмі ахвотна ўладальнікі бізнесу дзеляцца сваім вопытам: з чаго пачыналі, якія цяжкасці былі, якія далейшыя планы...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# НА ДАРОЗЕ, У ШКОЛЕ, ДОМА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Калі б не памылкі бацькоў, дзіцячыя жыцці можна было б захаваць: непрышпіленыя малыя пры дарожна-транспартных здарэннях проста вылятаюць з аўтамабіляў. Таму супрацоўнікі ДАІ гатовы зноў і зноў паўтараць, што ўсе пасажыры транспартных сродкаў павінны быць прышпіленыя — малыя — у аўтакрэслах, а дзеці, старэйшыя за 12 гадоў (ці ростам больш за 150 сантыметраў), — стандартнымі рамянямі бяспекі.

Традыцыйна ў канцы лета — пачатку верасня праводзіцца рэспубліканскае прафілактычнае спецыяльнае комплекснае мерапрыемства «Увага, дзеці!». Калі вы за бяспеку — не забудзьцеся ўключыць бліжняе святло фар. Так не толькі прыцягнеце ўвагу маленькіх пешаходаў да транспарту, але і нагадаеце іншым кіроўцам, што ў гэты час трэба быць асабліва ўважлівымі на дарозе. Па-першае, многія дзеткі толькі вярнуліся з летняга адпачынку і ім яшчэ трэба прызвычаіцца да інтэнсіўнага гарадскога жыцця. Па-другое, многія юныя пешаходы яшчэ засвойваюць новыя маршруты «дом—школа» і вучацца пераходзіць дарогу самастойна.

Шэраг прафілактычных мерапрыемстваў накіраваны на павышэнне адказнасці бацькоў і кіроўцаў. Супрацоўнікі ДАІ ідуць не толькі да малых, але і да дарослых (сустракаюцца з імі як на бацькоўскіх сходах на базе навучальных устаноў, так і ў працоўных калектывах), паказваюць відэа, расказваюць аб прычынах і наступствах дарожных здарэнняў з удзелам дзяцей і папярэджваюць, як гэтага пазбегнуць.

У краіне ўжо створаны сем аўтагарадкоў, дзе дзяцей навучаюць, як паводзіць сябе на дарозе ў якасці пешаходаў, пасажыраў. Адзнята багата ролікаў, фільмаў, мультфільмаў, створана мноства віктарын, навучальных праграм, разлічаных на дзяцей рознага ўзросту, для навучання бяспечным паводзінам на дарогах.

Традыцыйна кожную апошнюю пятніцу месяца праводзіцца адзіны дзень бяспекі дарожнага руху. Сёлета 30 жніўня ён праходзіць пад дэвізам «Бяспечная дарога ў школу — задача дарослых». Супрацоўнікі ДАІ кантралююць выкананне хуткасных рэжымаў, асабліва паблізу ўстаноў адукацыі, правілы праезду пешаходных пераходаў і перавозкі дзяцей-пасажыраў.

З пачаткам навучальнага года міліцыянеры па традыцыі будуць дзяжурыць за паўгадзіны да пачатку заняткаў паблізу ўстаноў адукацыі. Гэта робіцца, каб дысцыплінаваць бацькоў, якія падвозяць дзяцей да школы, прыняць меры па арганізацыі дарожнага руху, калі раптам стварaюцца нейкія калапсы, і, канешне, каб дапамагаць юным пешаходам перайсці дарогу. Дзяжурствы інспектараў працягнецца да 10 верасня.

## АБНОЎЛЕНЫЯ ДАРОГІ

У ліпені — жніўні традыцыйна праводзіцца абследаванне вулічна-дарожнай сеткі паблізу навучальных устаноў (у тым ліку дзіцячых садкоў, музычных школ, устаноў дадатковай адукацыі, каледжаў, дзіцячых паліклінік). Кантралюецца стан праезнай часткі, тратуараў, пешаходных дарожак, вонкавага асвятлення і тэхнічных сродкаў арганізацыі дарожнага руху ў месцах, дзе вучні ідуць у школу, вызначаецца, дзе неабходна ўсталяваць прыстасаванні, якія перашкаджаюць дзецям выбягаць на праезную частку. Усе недахопы фіксуюцца і пасля накіроўваюцца прадпісанні ўтрымальнікам вулічна-дарожнай сеткі, камунальным і дарожным арганізацыям, каб яны іх выправілі. Сёлета па выніках праведзеных абследаванняў службовым адкасным асобам камунальных і дарожных арганізацый выдадзена 493 прадпісанні. Усе яны павінны быць выкананы і недахопы выпраўлены да 1 верасня. Таксама інспектары ДАІ ўносяць прапановы ў аблвыканкамы, гарвыканкам па добраўпарадкаванні і стварэнні бяспечных умоў руху дзяцей, інфармацыйнымі лістамі заклікаюць гарадскія ўлады прыняць удзел у паляпшэнні інфраструктуры паблізу некаторых устаноў адукацыі.

Каля ўстаноў адукацыі ўсталёўваюцца прымусовыя сродкі зніжэння хуткасці — дарожныя няроўнасці. У тых жа месцах, дзе гэта зрабіць немагчыма (напрыклад, некаторыя сталічныя школы размяшчаюцца ўздоўж праспекта), будзе практыкавацца ўстаноўка мабільных датчыкаў фіксацыі парушэння хуткасных рэжымаў.

Напярэдадні навучальнага года Дзяржаўтаінспекцыя кантралюе тэхнічны стан школьных аўтобусаў, абследуе бяспеку іх маршруту, праводзіць інструктажы з кіроўцамі, пры якіх звяртае ўвагу на найбольш крытычныя пункты, дзе могуць узнікаць складанасці і трэба асаблівую увагу звярнуць на бяспеку ўдзелу ў дарожным руху.

## ПАД НАГЛЯДАМ

Шлагбаумы і агароджы вакол школ таксама ўстанаўліваюцца для таго, каб абараніць дзяцей ад няўважлівых кіроўцаў.

Сёння маецца багаты арсенал сродкаў і для таго, каб сачыць за бяспекай вучняў у самiх установах адукацыі і не дапускаць туды непажаданых гасцей: відэаназіранне, турнікеты, трывожныя кнопкі. Прапускная сістэма дазваляе і бацькам сачыць за перамяшчэннем дзіцяці (так ва ўстановах, у якіх дзеці карыстаюцца чыпаванымі карткамі, фіксуецца, у які час вучань прыйшоў у школу і калі яе пакінуў). Да таго ж у кожнай школе на вахце ёсць вартаўнік, які назірае за тым, каб сюды не прыйшлі староннія, вядзецца ўлік грамадзян, якія наведваюць установу.

Нельга не сказаць і пра дзяжурства адміністрацыі, так, перад заняткамі ў многіх школах настаўнікі і намеснікі дырэктара кожную раніцу сустракаюць дзетак на ўваходзе. Дапамагаюць дарослым і старэйшыя вучні — кожны тыдзень вызначаецца дзяжурны клас, які разам са сваім кіраўніком сочыць за парадкам.

Самыя юныя вучні трапляюць пад нагляд дарослых на ўвесь дзень, а восе дзецям, якія ўжо не будуць наведваць групу падоўжанага дня альбо пачынаюць вучыцца ў другую змену, менавіта бацькі павінны ўдзяліць асаблівую ўвагу. Такія хлопчыкі і дзяўчынкі толькі вучацца самастойнасці, і важна ў першыя месяцы вучобы прасачыць за тым, як дзіця дабіраецца да школы, як харчуецца, праводзіць вольны час.

— У 2014 годзе быў створаны міжведамасны каардынацыйны савет па прафілактыцы дзіцячага траўматызму ў Рэспубліцы Беларусь. Быў распрацаваны план мерапрыемстваў, якія павінны выконвацца да 2020 года, і надалей работа па папярэджанні дзіцячага траўматызму як такавога і ў прыватнасці дарожна-транспартнага будзе працягнута, — паведаміў **урач-траўматолаг кансультацыйна-паліклінічнага аддзялення ДУ «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр траўматалогіі і артапедыі» Аляксандр МУХЛЯ.** — У перыяд пачатку навучальнага года, асабліва ў нядзельныя дні, мы павялічваем у стацыянарах колькасць дзяжурных урачоў, прычым стараемся прыцягваць спецыялістаў, якія добра разбіраюцца менавіта ў дзіцячых траўмах. Папаўняюцца і расходныя матэрыялы. Шмат увагі аддаецца і прафілактычным мерапрыемствам...

— А што трэба рабіць для папярэджання траўматызму дзяцей на ўроках фізкультуры і перапынках? Вялікая колькасць вучняў у класах ці не адбіваецца на тым, што траўмаў становіцца больш? — цікавімся ў Аляксандра Мустаф'евіча.

— Гэта не залежыць ад колькасці дзяцей у класе, а толькі ад таго, навучана дзіця правілам бяспечных паводзінаў ці не. І адказнасць за наяўнасць такіх ведаў нясуць не толькі педагогі, але і бацькі. Настаўнікі фізкультуры павінны навучыць правільнаму падыходу да снарадаў, страхаваць, калі дзеці выконваюць практыкаванні. Бацькі ж павінны сачыць за тым, дзе і як дзіця праводзіць час пасля заняткаў, рабіць сваё жытло бяспечным. І сёння створаны цэнтры навучання бацькоў бяспечнаму спосабу жыцця, пачынаючы з перынатальных устаноў.

Аляксандр Мустаф'евіч выказаў сваю занепакоенасць тым, што апошнім часам набірае папулярнасць такая паслуга, як пракат самакатаў і ровараў. Часта ёй карыстаюцца падлеткі. Але як яны ставяцца да такіх сродкаў? Безнагляднасць за дзецьмі і ўсёдазволенасць могуць выклікаць пэўны пад'ём траўматызму. Напрыклад, у замежжы аддаюць асаблівую ўвагу такой праблеме, веласіпедыстаў і скутарыстаў абавязваюць карыстацца шлемамі і здаваць залікі на веданне правілаў дарожнага руху.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# КНІЖКІ ДОБРЫЯ ЛЮБІЦЬ...

**Школьныя партфелі двайняткам-першакласнікам Яўгену і Ягору Мушкаўцам, якія сёлета пойдуць у школу № 15, уручыў старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.**

Дарэчы, іх маці Таццяна Мікалаеўна выхоўвае чацвёра дзяцей. Раман пойдзе ў трэці клас, а Дзіяна — у пяты. Старэйшыя дзеці расказалі губернатару аб сваіх поспехах. У дзяўчынкі многа дыпломаў за выдатную вучобу, а хлопчык захапляецца футболам. Двайняткі ж падзяліліся, што ў шэсць гадоў ведаюць літары і умеюць лічыць.

Між тым дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы пасля нараджэння малодшых сыноў жанчына, якая працуе аператарам у аддзяленні паштовай сувязі № 48 Гомеля, атрымала трохпакаёвую кватэру. Уручаючы падарункі, Генадзь Салавей адзначыў, што дзецям трэба многаму навучыцца ў сваіх настаўнікаў.

Дабрачынная акцыя «Збяром партфель першакласніку» працягнецца да канца жніўня. У яе актыўна ўключыліся структурныя падраздзяленні аблвыканкама, установы аховы здароўя, арганізацыі і прадпрыемствы рэгіёна.

Па словах **намесніка начальніка аддзела выхаваўчай і сацыяльнай работы галоўнага ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама Наталлі МАРКАВАЙ,** да новага навучальнага года амаль тысяча маленькіх жыхароў вобласці атрымаюць партфелі з усім неабходным начыннем.

Матэрыяльная дапамога на 1,3 мільёна рублёў аказана больш чым 11 тысячам шматдзетных ці малазабяспечаных сем'яў, а таксама сем'ям, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Не засталіся без увагі дзеці з апякунскіх і прыёмных сем'яў, інтэрнатных устаноў, дзеці-інваліды.

Усяго сёлета за парты на Гомельшчыне сядзе 156 тысяч дзяцей. З іх 17 тысяч — першакласнікі. Прынамсі, гэта на паўтысячы больш, чым летась.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ПРЫЕМНАЯ НАВІНА

# КОНКУРС ЭКАЛАГІЧНЫХ ІНІЦЫЯТЫЎ

**У Краснапольскім раёне стартавала экалагічная ініцыятыва мясцовага фонду развіцця «Старт-Усход» «Зялёная эканоміка саду для будучага вёскі». Яна атрымала падтрымку на конкурсе экалагічных ініцыятыў, які праводзіўся летась.**

З усёй краіны на яго паступіла 136 заявак. Але выбрана было ўсяго 11, у тым ліку і краснапольская. Мясцовы фонд развіцця «Старт-Усход» будзе рэалізоўваць яе ў партнёрстве з васьмю ўстановамі адукацыі Краснапольскага, Слаўгарадскага, Быхаўскага і Чэрыкаўскага раёнаў і дзяржаўнай прыродаахоўнай установай «Слаўгарадская «Блакітная крыніца». Адпаведна з праектам, да снежня 2020 года на тэрыторыі ўсіх гэтых раёнаў будзе створана сетка з 10 садаводчых гадавальнікаў, на базе якіх запрацуюць рэсурсныя цэнтры, дзе спецыялісты стануць навучаць удзельнікаў праекта, як з карысцю задзейнічаць пустуючыя прышкольныя ўчасткі і агароды грамадзян. Гэта ініцыятыва дапамога рэалізаваць бізнес-планы 100 сем'ям — яны атрымаюць саджанцы для арганізацыі сваіх асабістых садоў і такім чынам змогуць палепшыць свае даходы.



Фота Рамана ЯЗЕРСКАГА.

Майстар-клас па акуліроўцы пладовых дрэў у Пачапоўскім ВПК.

Як адзначыла **старшыня Краснапольскага райсавета дэпутатаў Анжаліка ГОМАН,** у раёне ёсць станоўчы вопыт па рэалізацыі падобнага праекта і стварэння гадавальніка і саду пладова-ягадных і дэкаратыўных культур на базе Пачапоўскага і Казельскага вучэбна-педагагічных комплексаў. Гэтая дзейнасць дапамагла ўстановам палепшыць свой эканамічны стан і выхаваць у дзяцей цікавасць да работы на зямлі. Цяпер тут гатовы падзяліцца карыснымі парадамі з іншымі.

Ініцыятыва мясцовага фонду развіцця «Старт-Усход» рэалізуецца ў рамках праекта ПРААН «Далучэнне грамадскасці да экалагічнага маніторынгу і паляпшэння кіравання ахоўвай навакольнага асяроддзя на мясцовым узроўні» ў партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і ахоўвы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь і фінансуецца Еўрасаюзам.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# НАВАСЕЛЛЕ Ў АСТРАЎЦЫ

**Арыгінальны па дызайне і архітэктуры цэнтр творчасці дзяцей і моладзі ўрачыста адкрылі ў горадзе атамшчыкаў.**

Астравец атрымаў доўгачаканы падарунак падчас свята горада, піша «Островецкая газета». Асабліва былі ўзрушаны выхаванцы цэнтра, якія прадэманстравалі свае таленты перад прысутнымі. У сваю чаргу госці свята — прадстаўнікі ўлады і будаўнічай арганізацыі — уручылі цэнтру сертыфікаты на набыццё выставачных стэндаў, камп'ютарнай і бытавой тэхнікі.




На чарзе — адкрыццё ў горадзе новай школы і дзіцячага садка.

НЕДЗІЦЯЧАЕ ПЫТАННЕ

# ПАЎТАРЭННЕ ПРОЙДЗЕНАГА

## Як вучаць бяспецы выхаванцаў дзіцячага садка?

**Дзіцячы садок у аграгарадку Белавежскі запатрабаваны і запоўнены. Зараз тут выхоўваецца 108 дзяцей, працуе шэсць груп. Ёсць ясельная група і група дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення. Працоўны калектыў налічвае крыху больш за 30 чалавек. Садок — амаль равеснік пасёлка, гэтай восенню будзе адзначаць сваё 35-годдзе. Некаторыя супрацоўнікі, у тым ліку загадчыца Таццяна Акеліна, былі ў свой час выхаванцамі садка.**

Таццяна Уладзіміраўна, стаўшы загадчыцай, змагла рэалізаваць свае дзіцячыя ідэі. Прызналася, што тады яна хацела, каб пры ўваходзе на тэрыторыю было больш загадкавасці і рамантызму,




дзяцей сустракалі казачныя героі. Цяпер яны «пасяліліся» побач з дарожкамі і на клумбах і перыядычна становяцца ўдзельнікамі розных тэматычных гульняў. Але пра гэта крыху пазней. Варта сказаць, што супрацоўнікі і выхавальнікі любяць сваю ўстанову, садок патанае ў кветках, нават далікатныя і патрабавальныя гладыёлусы тут ўратаваліся ад спёкі. Але ж адным з галоўных кірункаў выхаваўчай работы ў садку лічыць неабходнасць навучыць дзяцей правілам бяспекі. Таму на раённым конкурсе сярод дашкольных устаноў па гэтым пытанні сёлета занялі першае месца ў адной з намінацый. Указаная намінацыя датычылася супрацоўніцтва дашкольнай установы з раённым аддзелам МНС. Такая сумесная работа праводзіцца на рэгулярнай аснове.

На конкурс прадставілялі тэматычныя куткі, арганізаваныя і аформленыя ў кожнай з груп.

— Да афармлення такіх куткоў падышлі творча, — расказвае і паказвае Таццяна Акеліна. — Але ж галоўнае, каб яны працавалі, прыносілі карысць, пакідалі нейкі след у свядомасці дзяцей. Бо што закладзеш у гэтым узросце, тое і застанецца з чалавекам на ўсё жыццё. Нашы выхавальнікі самі распрацавалі настольную гульню для замацавання правілаў бяспекі. Менавіта па гэтай гульні з удзелам казачных герояў дзеці вучацца паводзіць сябе ў надзвычайнай сітуацыі, трымацца ў грамадскіх месцах, на дарозе, каля вады, у лесе. Яшчэ мы ўдзяляем увагу вырабу нагляднасці для бацькоў. Прыйшоў па сына ці дачку ў садок, пакуль дзіця збірае свае рэчы, апранаецца, міжволі кінеш погляд на плакат, і вока абавязкова зачэпіцца за адзін з напамінаў аб правілах бяспекі. Напомніць бідавочнае бывае не лішні, калі гэта датычыцца бяспекі, — разважае загадчыца садка.

Таму ў дзіцячай установе на бацькоўскіх сходах, на розных мерапрыемствах гасцямі бываюць прадстаўнікі аддзелаў МНС, унутраных спраў, медыкі, кіраўнік мясцовай улады. Калі ў краіне назіраўся ўсплёск няшчасных выпадкаў, звязаных з выпадзеннем дзяцей з адчыненых вокнаў, засяроджвалі ўвагу на гэтай тэме. Пачынаецца купальны сезон — спецыялісты праводзяць гутарку пра бяспеку на вадзе. Ну а дзіцячае свавольства з агнём — вечная тэма, якая патрабуе пастаяннай увагі. Гэта работа з бацькамі.

— З выхаванцамі таксама праводзяць гутаркі спецыялісты. У іх распрацаваны методыкі работы з усімі ўзроставымі катэгорыямі, яны прыходзяць да дзіцячай аўдыторыі падрыхтаванымі, і дашкольнікі звычайна ўважліва слухаюць людзей у пагонах, — гаворыць Таццяна Акеліна.

Выхавальніца Анастасія Саўчук у сваёй групе падчас гульні на свежым паветры не прамінне лішні раз напомніць правілы бяспекі. І хоць у летні перыяд няма спецыяльных заняткаў, але дзеці любяць гуляць на пляцоўцы дарожнага руху. Педагог лічыць не лішнім паўтарыць пройдзенае ў гульнявой форме. «Як трэба пераходзіць дарогу ў гэтым месцы? На які сігнал святлафора можна ісці, а на які трэба стаяць? Ці правільна зробіць гэты гном, калі сядзе адпачыць на паласатым пераходзе?» І самыя маленькія выхаванцы групы адказваюць упэўнена і без памылак.

Калі ж гаворка заходзіць пра штодзённую бяспеку ўстановы адукацыі, загадчыца разважае, што нядрэнна было б мець камеру


Гутарка інспектара МНС.

відэаназірання. У школе нядаўна камеры былі ўстаноўленыя. «Наш садок знаходзіцца ў самым цэнтры пасёлка, па крузе размешчаны ўсе асноўныя сацыяльныя аб'екты: ФАП, Дом культуры, прадпрыемствы грамадскага харчавання і гандлю. Тэарэтычна ў памяшканне можа ўвайсці кожны ахвотны. Адзін час актыўнасць праяўлялі гандляры рознай дробнай прадукцыяй, давялося іх стрымліваць. Але цяпер мы склалі між сабой графік, і ўсе супрацоўнікі ясляў-садка па гадзіне дзяжураць на першым паверсе, сочаць за парадкам, сустракаюць наведвальнікаў. У ідэале, вядома, добра было б займець вахцёра, але ж мы разумеем, што гэта дадатковыя фінансавыя выдаткі, таму пакуль абыходзімся сваімі сіламі».

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Камянецкі раён.*

РЭПАРЦЁР

# ШКОЛА

**Яна ўражвае нават памерамі. Гэтакі вялікі прасторны будынак з незвычайным дызайнам і рознакаляровымі велічэзнымі літарамі на ўвесь фасад — школа. Вакол будынка мноства спартыўных пляцовак. Будаўнікі яшчэ рабілі апошнія прыгатаванні на аб'екце, а дарослыя і дзеці ўжо занялі прылеглую да школы спартыўную тэрыторыю. Школа № 46 у Магілёве стваралася як суперсучасная, нават знешне бачна, што тут прадумана ўсё да дробязяў.**
**Разам з кіраўніком адміністрацыі Ленінскага раёна Аляксеем БАГАЙЧУКОМ і дырэктарам школы Надзеяй МЯШКОВАЙ за тыдзень да пачатку навучальнага года мы ацанілі маштабы новай установы і яшчэ раз пераканаліся, што яна зараз не толькі самая «крутая» ў Магілёве, але і самая бяспечная.**

— Спартыўныя пляцоўкі рабіліся з улікам апошніх да іх патрабаванняў. Сучаснае пакрыццё, абсталяванне — усё скіравана на тое, каб заняткі былі не толькі прыемнымі, але і бяспечнымі, — звяртае ўвагу Аляксей Багайчук, калі мы аглядаем так званы спартыўны гарадок.

— Тут нічога няма паказнога, усё функцыянальнае, — удакладняе ён. — Тая ж каробка для фігурнага катання летам можа выкарыстоўвацца для катання на роліках: для гэтага маецца спецыяльнае пакрыццё. Хутка будуць устаноўлены трэнажоры, на якіх змогуць займацца не толькі школьнікі, але і ўсе ахвотныя. Дарэчы, на спартыўнай тэрыторыі 45-й школы, якая параўнальна нядаўна была пабудавана ў мікрараёне Спадарожнік, па вечарах таксама вельмі шматлюдна. Шмат увагі ў школах аддаецца веданню правілаў бяспечнага дарожнага руху. На двары тут таксама зроблена спецыяльная пляцоўка з дарожнымі знакамі, пешаходнымі сцяжынкамі, складанымі скрыжаваннямі. На ёй можна праводзіць хвілінкі дарожнай бяспекі, удасканальваць свае веды па асновах бяспекі жыццядзейнасці.

Начынне школы — асобная размова. Там наогул усё рабілася з пункту гледжання камфорту і бяспекі, у тым ліку і для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Пандусы, ліфты, спецыяльныя санвузлы, нават мэбля для «асаблівых» дзяцей — усё прадугледжана.

Фае ўражвае сваімі памерамі і функцыянальнасцю, яно мае некалькі ўваходаў і выхадаў, прастора размежаваная калонамі.

— У нас прадугледжана спецыяльная пропускная сістэма, — удакладняе дырэктар. — Хутка на ўваходзе з'явяцца спецыяльныя турнікеты і зайсці проста так у будынак ніхто не зможа. Школьнікі, напрыклад, толькі па картцы навучэнца. Школа па перыметры таксама ўся пад наглядам — для гэтага ўстаноўлена сістэма відэаназірання.

Цікавінка фае — вялікі на ўсю сцяну барэльеф са славутасцямі Магілёва — тут і ратуша, і трыумфальная арка, і Падмікольле, і астролаг з плошчы Зорак. З вялікай керамічнай пліткі на падлозе зроблены прыгожы дызайнерскі «дыван».



Мы падымаемся на другі паверх, і нельга не заўважыць, што нават прыступкі тут камфортнай велічыні, па краі ідуць спецыяльныя канаўкі, каб нага не слізгала. Сама лесвіца прасторная і шырокая, а дзверы спрэс на даводчыках.

— Аконныя блокі ў класах, дарэчы, выключна з замочкамі, — удакладняе на ходзе дырэктар. — Усё зроблена ў адпаведнасці з санітарнымі нормамі і правіламі пажарнай бяспекі.

Школа цалкам інфарматызаваная, у кожным кабінеце — мультыборды, для настаўнікаў прадугледжаны электронны класны журнал, для вучняў — электронны дзённік, плюс лінгафонныя кабінеты, камп'ютарныя класы, выдатны кабінет для працоўнага навучання, сучасная бібліятэка.

— Ахвотных працаваць у нас было шмат, перавага аддавалася найбольш вопытным, — удакладняе Надзея Мяшкова.

Уся школа падзеленая на тры блокі — пачатковая школа, старэйшая плюс блок, дзе знаходзяцца спартыўныя і актавы залы, а таксама лінгафонныя і камп'ютарныя класы.

Для першакласнікаў наогул прадугледжаны не толькі спецыяльныя класы, дзе яны будуць вучыцца, але і спальні, і пакоі для гульні. Для развіцця дзяцей ёсць зала рытмікі, трэнажорная зала, нават грымёрка са столікамі і спецыяльным асвятленнем. Да паслуг юных талентаў вялікая актавая зала з шыкоўнай сцэнай.

— Прыемна, што такая школа з'явілася ў Магілёве і дзеці будуць выхоўвацца і вучыцца ў такой прыгажосці, — радуецца Надзея Мяшкова.

Мы ідзём па шырокім школьным калідоры з вялікімі рэкрэацыямі. Заходзім у прасторныя кабінеты. Там таксама ўсё прадумана. Ёсць нават шафы для асабістых рэчаў школьнікаў. Каб нічога не стаяла каля школьных сталоў і наогул не адцягвала ўвагу вучня. Зверху проста над партамі цягнуцца лямпы асвятлення, каб школьнікі не сапсавалі зрок раней часу. На ўваходзе ў кабінет — умывальнікі.

Спартыўныя залы наогул уражваюць. Вялікая, напрыклад, плошчай 648 квадратных метраў са спецыяльным балконам для гледачоў наверсе. Кажуць, што тут змогуць праводзіцца спаборніцтвы рэспубліканскага значэння.

— Гэта зала гульнявых відаў спорту па міні-футболе, гандболе, валейболе і баскетболе, — кажа **намеснік дырэктара Юрый ВОЛКАЎ**. — Сярод школьных спартыўных залаў Магілёва гэта самая вялікая. Прыблізна такая ж у 45-й школе. Марым нават алімпіяду сюды прывезці. А чаму не памарыць? Мы былі ў Маладзечне на рэспубліканскай алімпіядзе, там умовы правядзення больш сціплыя. З пункту гледжання бяспекі тут таксама ўсё прадугледжана. Пропускная здольнасць вялікай спартыўнай залы разлічана на знаходжанне ў ёй адначасова 50 навучэнцаў, малой — 25. Няма перапоўненасці, а значыць няма пагрозы траўмавацца. Што датычыцца вулічных спартыўных аб'ектаў, там наогул вельмі шмат вольнай прасторы, а значыць таксама бяспечна. Усе дзеці

# Галоўны крытэрый —

**Да пачатку навучальнага года супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях правялі праверкі ўмоў бяспечнай арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўсіх школах краіны. У выніку парушэнняў, якія пагражаюць жыццю і здароўю вучняў, не выяўлена. Амаль усе школы ўжо атрымалі пашпарты гатоўнасці.**

— МНС праводзіць ацэнку стану школ на сістэмнай аснове на працягу года. Асаблівую ўвагу аддаём ёй у перыяд падрыхтоўкі да новага навучальнага года. У выніку ні адна школа не засталася без увагі, — падкрэслівае **першы намеснік начальніка ўпраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Васіль СІЎЧАК**.

Наглядна-прафілактычныя мерапрыемствы праведзены ў 2864 школах па ўсёй краіне.

— Як правіла, парушэнні супрацьпажарных патрабаванняў рэжымнага характару ліквідаваліся падчас праверак і маніторынгаў на месцы, — тлумачыць Васіль Сіўчак. — Па астатніх пытаннях кіраўнікам і службовым асобам устаноў адукацыі мы аказалі кансультацыйна-метадычную дапамогу ў выбары аптымальных варыянтаў супрацьпажарнай аховы аб'ектаў.

Тым не менш кіраўнікі і службовыя асобы сістэмы адукацыі атрымалі 13 прадстаўленняў аб ліквідаванні прычын, якія садзейнічаюць здзяйсненню правапарушэнняў па пытаннях супрацьпажарнай бяспекі. Амаль ва ўсіх установах адукацыі былі арганізаваны супрацьпажарныя інструктажы, іх прайшло 30 тысяч чалавек.

— Падчас кантролю гатоўнасці школ да новага навучальнага года парушэнняў заканадаўства, якія

Тэлесеткі

# ШТО ГЭТА ЗА ДЗЕЎЧЫНА І ДЗЕ ЯНА ЖЫВЕ?

**У Белтэлерадыёкампаніі пачаліся здымкі відэавізітовак для ўсіх 10 фіналістаў нацыянальнага адбору на дзіцячае «Еўрабачанне-2019». Нагадаем, сёлета ў спісе прэтэндэнтаў ад нашай краіны толькі дзяўчаты.**

Тэму, якая звязвае ўсе ролікі, падказаў тэлевізійнікам афіцыйны слоган міжнароднага конкурсу «Падзяліся радасцю» і яго лагатып — паветраны змей. Усе фіналісткі змайструюць у кадры сваіх змеяў і запусцяць іх у неба. Пры гэтым, зазначае рэжысёр ролікаў Яна Шаблыка, пляцоўку для кожнага ўдзельніка падбіралі індывідуальна, арыентуючыся на захапленні, характар і музыку кожнай юнай артысткі ці калектыву.

Гатовыя сюжэты працягласцю ў 40 секундаў гледачы ўбачаць непасрэдна перад выступленнямі конкурсантаў — 20 верасня ў прамым эфіры фінальнага гала-канцэрта на Беларусь 1 і Беларусь 24, а таксама ў анлайнтрансляцыі на сайце www.tvr.by.



Фота прадстаўлена прэс-службай БТРК.

# НА ЛІНЕЙКУ СТАНАВІСЯ!

**2 верасня ў ранішнім эфіры тэлеканала Беларусь 2 на яе збярэцца творчая каманда праекта «Уключайся!». Першы выпуск новага сезона вядучыя вырашылі сумясціць з лінейкамі ў школах і расказаць пра яго, а таксама аддзячыць усім тым, хто стаў для іх настаўнікамі ў свеце тэлебачання.**

Напрыклад, Юрый Ярошык прадставіць гледачам свайго педагога з Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, а Ілью Конанава «прывядзе на лінейку» яго дзядуля, таксама педагог з вялікім стажам. Прадстаўнікі розных пакаленняў абмяняюцца ў праграме вопытам і разам пройдуць майстар-класы ад запрошаных гасцей.

А ўжо з 3 верасня «Уключайся!» пачне тэлевізійныя экскурсіі па розных населеных пунктах Беларусі — адзін з наступных выпускаў, у прыватнасці, будзе прысвечаны тысячагоддзю Брэста.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# ШАШКІ

**(«Звязда») Выпуск № 95**

Рэспубліканскі конкурс па рашэнні шашачных кампазіцый, прысвечаны памяці шматгадовага вядучага шашачнага аддзела газеты «Звязда», міжнароднага майстра па шашачнай кампазіцыі, Мікалая Мікалаевіча Грушэўскага. II тур.

Заданні конкурсу:

№ 5



Белыя простыя шашкі: c3, b4, e5, d6, c7, e7 (6).

Чорныя простыя шашкі: a3, e3, g3, d4, g5, g7, b8 (7).

№ 6

Белыя простыя шашкі: d2, f2, g3, b4, a7 (5).

Чорныя простыя шашкі: b2, f4, e5, d6, g7 (5).

№ 7

Белыя простыя шашкі: a1, b2, d2, e3, g1, h4 (6).

Чорныя простыя шашкі: b4, c5, d4, e5, f2, g3 (6).

№ 8

Белыя простыя шашкі: d2, d4, e5, f2, f6, g3 (6).

Чорныя простыя шашкі: b2, b4, c7, d6, f4, h2 (6).

5 і 6 заданні складзеныя вядучым аддзела, заданні 7 і 8 склаў украінскі шашачны кампазітар А. Ныч.

Для тых, хто не паспеў уключыцца ў конкурс, паведамляем, што гэта можна яшчэ зрабіць і паўтараем першыя чатыры заданні.

№ 1

Белыя простыя шашкі: e1, h2, a3, c3, e3, f4, h4 (7).

Чорныя простыя шашкі: a5, c5, g5, d6, f6, h6, d8 (7).

№ 2

Белыя простыя шашкі: e1, g1, f2, e3, b4, f4 (6).

Чорныя простыя шашкі: h4, e5, g5, b6, d6, h6 (6).

№ 3

Белыя простыя шашкі: c3, d4, e3, f2, f4, h6 (6).

Чорныя простыя шашкі: b8, d6, f6, f8, g5, g7 (6).

№ 4

Белыя простыя шашкі: a7, b6, d4, f4, f6, g5 (6).

Чорныя простыя шашкі: b2, b4, c5, d2, f2, h4 (6).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

З лістоў чытачоў: Леанід Жыхар з Мядзела піша: «Я даўні сябар вашай газеты. Захапляюся шашкамі і прынамсі — рашэннем шашачных пазіцый вашага выдання. Але да гэтага часу не дабраўся адсылаць у газету. Мне вельмі падабаецца рашаць заданні аддзела. Яны заўсёды цікавыя, змястоўныя і даступныя для аматараў шашак!»

З 22 жніўня да 1 верасня ў Краневе *(Балгарыя)* праходзіць маладзёжны чэмпіянат свету па шашках-64. У першы дзень спаборніцтваў у бліскавічнай праграме ў сваіх узроставых групах чэмпіёнамі свету сталі Уладзіслаў Валюк, Міхаіл Семянюк і Яна Якубовіч. 24 жніўня адбыўся чэмпіянат свету па хуткай гульні. Залатыя медалі здабылі Аляксандра Спірына, Міхаіл Семянюк, Паліна Петрусёва, Вікторыя Нікалаева і Марат Леў.

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**



Сядзі і глядзі

# «Элементарна, Ватсан!»

## 40 гадоў таму пачалася савецкая экранізацыя Артура Конан Дойла

**За першы фільм, які адкрыў цэлую серыю кінастужак аб прыгодах знакамітага прыватнага сышчыка Шэрлака Холмса і яго сябра, біёграфа і памочніка доктара Ватсана, рэжысёр Ігар Масленнікаў узяўся яшчэ ў 1979 годзе — з падачы сцэнарыстаў, якія здолелі стварыць аднолькава цікавых і яркіх герояў. Да 1986-га выйшла пяць дэтэктыўных фільмаў агульным аб'ёмам у 11 серый, альбо 766 хвілін.**



На галоўную ролю зацвердзілі Васіля Ліванава — не адразу, бо акцёр славіўся няпростым характарам, але практычна безальтэрнатыўна. Другога кандыдата ў Холмсы, Аляксандра Кайданоўскага, рэжысёр запрасіў на пробы на ўсякі выпадак, але бачыў сваім героем выключна Ліванава, у якім «адчувалася парода» і які, дарэчы, нават знешне быў падобны да сышчыка з малюнкаў брытанскага мастака, блізкага сябра самога Конан Дойла. Выканаўцу ролі Ватсана давялося шукаць значна даўжэй, бо ніхто не ўяўляў, як той павінен выглядаць. У адным з акцёрскіх альбомаў знайшлося фота Віталя Саломіна з прыклеенымі «армейскімі» вусамі — гэты здымак трапіў на вочы рэжысёру і падаўся таму якраз, што трэба. У верную і адважную гаспадыню дома місіс Хадсан пераўвасобілася Рына Зялёная — нягледзячы на тое, што актрысе было ўжо больш за 75 гадоў і што ёй давялося вазіць на здымкі з Масквы, яна выдатна справілася з роляй. Без праблем адшукалі і Марыярці — Віктара Яўграфава, які акрамя запамінальнай знешнасці меў навыкі каскадзёра і захапляўся баявымі мастацтвамі. Што праўда, у карціне Марыярці агучыў Алег Даль, бо ў самога акцёра для зладзейскай аўры сілы голасу не хапала. Не сваім галасам размаўляе і інспектар Лестрэйд — Барыслаў Брандукоў, украінскае маўленне якога ўмела замаскіраваў дублёр з «Ленфільма» Ігар Яфімаў.



Стужку здымалі пераважна ў павільёнах «Ленфільма» (адну толькі гасцёўню ўзводзілі і абстаўлялі наноў чатыры разы, бо фільмы здымаліся з перапынкамі), а таксама на вуліцах Ленінграда, Рыгі і Таліна, а яшчэ на Каўказе — тут у Абхазіі на Гегскім вадаспадзе знайшлі натуру для ракавога паядынку сышчыка і геніяльнага ліхадзея, прафесара Марыярці. Лондан у гэты спіс, зразумела, не трапіў — тым не менш атмасферу дома на Бейкер-стрыт, 221Б удалося стварыць і сіламі савецкіх кінематаграфістаў. Адзіны насамрэч англійскі эпізод ва ўсім серыяле — панарамныя здымкі Тэмзы, якія па просьбе рэжысёра зрабілі і перадалі карэспандэнты Цэнтральнага тэлебачання ў Вялікабрытаніі.

Васіль Ліванаў і Віталь Саломін пасябравалі не толькі на экране, але і ў жыцці — сяброўскія стасункі падтрымлівалі і іх сем'і ажно да трагічнай смерці Саломіна ў 2002 годзе. У 2007-м акцёры зноў паўсталі разам — у бронзе, у выглядзе скульптурнай кампазіцыі на Смаленскай набярэжнай Масквы. А ў 2012-м аўтарытэтнае выданне The Telegraph склала спіс дзесяці найлепшых Ватсанаў усіх часоў — Віталь Саломін у ім на другім месцы. Ну і, канешне, як не згадаць аб прэстыжнай узнагародзе, Ордэне Брытанскай імперыі, якой быў адзначаны «наш» Холмс!

**Сказана!**

- «Капернік... Знаёмае прозвішча, што ён зрабіў?»
- — Дарагі Холмс, вы вялікі сышчык!
  — Дарагі Ватсан, я заўжды вам гэта гаварыў!
- «Наогул, доктар, я стараюся не глядзець, хто прыходзіць, хто сыходзіць... І вам не раю».
- «Не, сапраўды скаціна! Уваравайся ў дом, наслядзіў, сапсаваў добрую рэч!»
- — Вы хочаце сказаць, што не чытаеце раманаў? Гэта ж Дзікенс!
- — Не чытаў, не чытаю і не збіраюся чытаць. Я наогул не люблю белетрыстыку.

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.00** «Зона Х» (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20** Навіны надвор'я.
**10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Выпрабаванне». 1-я і 2-я серыі (16+).**
**13.05 Меладрама «Тры дні на каханне» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**15.25** Маршрут пабудаваны (12+).
**16.00** «На вылет!» (12+)
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** Нашы (6+).
**22.05 Серыял «След» (16+).**
**23.40** Арэна.
**0.25** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.40** «Тэлебарометр».
**9.05, 20.05 Серыял «Зразумець. Даравáць» (16+).**
**10.10** «Капейка ў капейку» (12+).
**10.45** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**11.20** «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
**12.10** М/с «Чарапашкі-ніндзя» (12+).
**13.00** Анімацыйны фільм «Мадагаскар-3» (12+).
**14.25 Камедыя «Знаёмства з Факерамі-2» (16+).**
**16.05 Фантастыка «Прывід у даспехах» (16+).**
**17.45** «Веру не веру» (16+).
**19.15** «Суперлато».
**21.10** «Спортлато 6 з 49», КЕНО.
**21.15** «Тата папаў» (16+).
**23.00** «Ідзі сюды і танцуй».
**23.05 Серыял «Жаночы доктар-2» (16+).**
**0.00** «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Квас на мясе або грыбах з ільняным насеннем.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 12.20, 20.35** «Гэты дзень».
**8.30 «12 крэслаў». Камедыя (12+) [СЦ].**
**11.05, 21.05** «Легенды кіно». Сяргей Філіпаў (12+).
**11.45** «Архітэктура Беларусі».
**12.25** «Беларуская кухня». Смятаннік, адтопленае малако.
**12.55** «Наперад у мінулае».
**13.20** «Навукаманія» (6+).
**13.45, 21.40 «Ваенна-палявы раман». Меладрама (12+) [СЦ].**
**15.15 «Вялікі перапынак». Камедыя (12+).**
**19.50** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Алесь Родзім.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.15** «Нацыянальны хіт-парад».

## Беларусь 5

**6.40** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Мінск» — БАТЭ (Барысаў).
**8.35** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
**9.15** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. «Юнацтва-Мінск» (Беларусь) — «Тршынец» (Чэхія).
**11.10** Вынікі тыдня.
**11.55** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 1/8 фіналу.
**14.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Тотэнхэм».
**15.55** Мастацкая гімнастыка. Challenge Cup. Казань.
**18.30** Авертайм. КХЛ.
**19.00** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Нафтахімік» (Нефцякамск). (У перапынках — Авертайм. КХЛ.)
**21.30** Спорт-цэнтр.
**21.40** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір. Берлін.
**23.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.

## АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** (з субцітрамі), **8.00** (з субцітрамі), **9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.10** «Контуры».
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.10 Серыял «Сярэбраны бор» (16+).**
**12.05** «Модны прыгавор» (6+).
**13.10 Серыял «Дыхай са мной» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 0.05** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.25, 18.20, 23.05** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10 Серыял «Дыпламат» (16+).**

## СТБ

**5.30** «Вялікі горад».
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца». Студыя добрага настрою» (6+).
**9.05** «Вадзіць па-руску» (16+).
**9.25** «Тыдзень».
**10.40 «Меч». Серыял (16+).**
**11.40** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.00** Фінал Рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка».
**13.45, 20.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**14.45** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**15.40, 16.50 «Мар'ін гай-2». Серыял (16+).**
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**21.20, 23.45** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**22.05** «Глядзець усім!» (16+)
**23.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.25** «Мінтранс» (16+).
**1.10** «Самая карысная праграма» (16+).

## МІР

**6.00, 10.10, 3.30 Маст. фільм «Дзяржаўная граніца» (12+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**14.10** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 2.45** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 0.55** «Такому мама не навучыць» (12+).
**17.20, 19.20 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.55** «Гульня ў кіно» (12+).
**20.40, 22.45, 0.10 Серыял «Закон і парадак» (16+).**
**1.20 Маст. фільм «На Дзерыбасаўскай добрае надвор'е, або На Брайтан-Біч зноў ідуць дажджы» (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**9.00 Маст. фільм «Вам і не снілася...»**
**10.45** «Плюс мінус». Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35** «Лёс чалавека» (12+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30, 22.25, 23.10** «Хто супраць?» Ток-шоу (12+).
**17.25** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40 Серыял «Капітанша. Працяг» (12+).**
**0.25** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** За гранню (16+).
**6.25** Беларусы (6+).
**7.15, 8.05 Драма «Кіроўца аўтобуса» (12+).**
**10.20** «Чакай мяне» (12+).
**11.15 Серыял «Ляснік» (16+).**
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).**
**16.25 Серыял «Павуцінне» (16+).**
**17.20** «ДНК» (16+).
**19.40** Сёння. Галоўнае.
**19.50 Серыял «Шэф» (16+).**
**21.40 Серыял «Пёс» (16+).**
**22.35** «НЗ.by».
**23.00 Серыял «Сведкі» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.55, 18.15, 21.05, 0.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 16.05** «Мультпарад». «Цімон і Пумба».
**7.30 Трылер «Падводная лодка» (18+).**
**9.30, 18.20 Серыял «Без тэрміну даўнасці» (16+).**
**10.25, 16.00** «Гумарынка».
**10.30** «BELFASHION.TV» (12+).
**11.45 «Глядзім усёй сям'ёй». Камедыя «Прыгоды Падынгтана» (0+).**
**13.15, 19.15 Серыял «Мар'ін гай» (16+).**
**14.50 Серыял «Хваран» (12+).**
**16.30 Трылер «Прыватны дэтэктыў» (16+).**
**19.10** «Рэальны бізнес».
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Драма «Сакрэтнае дасье» (16+).**
**23.10 Серыял «Бульварныя жахі» (16+).**





## ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**8.20** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
**9.20** М/ф «Марын і яго сябры» (0+).
**9.50** М/ф «Тры каты» (0+).
**10.10** М/ф «Цімон і Пумба» (0+).
**10.45** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!» (6+)
**11.45** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**12.20** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**14.45** Фільм-катастрофа «2012» (12+).
**17.50** Анімацыйны фільм «Робаты» (12+)
**19.35** «Уральскія пельмені» (16+).
**21.00** Фантастыка «Гадзіла» (12+).
**23.45** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**0.15** Серыял «Лондан-град» (16+).
**2.10** «Проста кухня» (16+).
**2.40** «Рогаў. Студыя 24» (16+).
**3.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
**4.20** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Страшная гісторыя». «Рыкі-Цікі-Таві». «Сабака ў ботах». «Цудоўны званочак». М/ф.
**7.45** «Жылі-былі стары са старой». Маст. фільм [СЦ].
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.25** «12 разгневаных мужчын». Маст. фільм.
**12.00** «Лісты з правінцыі». Камчатка [СЦ].
**12.30, 1.05** Дыялогі пра жывёл. Лора Парк. Тэнерыфе [СЦ].
**13.15** «Іншыя Раманавы». «Апошні крыжаносец Расійскай імперыі» [СЦ].
**13.45** Канцэрт Усерасійскага юнацкага сімфанічнага аркестра.
**14.35** «Зялёны агенчык». Маст. фільм [СЦ].
**15.50** «Больш, чым каханне». Яўген і Ніна Святланавы [СЦ].
**16.30** «Карціна свету».
**17.10** «Пешшу...» Масква — Ленінградская шаша [СЦ].
**17.40** «Блізкае акружэнне братоў Запашных».
**18.35** «Рамантыка раманса». «Эдуарду Хілю прысвячаецца...»
**19.30** Навіны культуры.
**20.10** 100 гадоў з дня нараджэння Людмілы Цалікоўскай. «Сэрцы чатырох». Маст. фільм [СЦ].
**21.45** Гала-канцэрт зорак сусветнай оперы ў тэатры «Ла Скала».
**23.55** «Прыехалі на конкурс кухары...» Маст. фільм [СЦ].
**1.45** «Шукальнікі». «Пакаянне» атамана Аненкава».
**2.30** «Шпіёнскія страсці». «Цудоўны Гоша». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1989-ы. 1-я частка. 2008 год (12+).
**7.05, 8.45, 9.45, 11.00, 13.05, 14.45, 17.00, 20.25, 20.45, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.20** Дак. фільм «Маскоўская элегія» (12+).
**9.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** Колба часу «(16+).
**12.00** Маст. фільм «Маё каханне» (12+).
**13.35** «Лайма Вайкуле ў канцэртнай зале «Расія». 1990 год (12+).
**14.35, 20.35** «Мастак і паэт Міхаіл Гробман чытае свае вершы». 2005 год (18+).
**15.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**16.00** Фільм-канцэрт гурта «Дзеці». 1988 год (18+).
**18.00** Фільм-спектакль «Энергічныя людзі». 1988 год (16+).
**21.00** Тэлеспектакль «Зойкіна кватэра». 1988 год (16+).
**0.00** «Яловая субмарына». «Аукцыён». Як чуецца, так і пішацца» (18+).
**1.15** «Не смешна». «Перад люстэркам». 1980 год (12+).
**1.45** Фільм-канцэрт «Сустрэчы з Алай Пугачовай». 1984 год (12+).
**4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).

## EuroSport 1

**1.30, 22.40** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс».
**1.45, 19.15** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**2.30, 6.30** Тэніс. US Open. Жанчыны. Фінал.
**4.00, 22.00** Тэніс. US Open.
**5.30** Тэніс. US Open. Мікст. Фінал.
**7.30** Конны спорт. Global Champions Tour.
**8.30, 11.45, 13.55** Веласпорт. «Вуэльта».
**9.30** Настольны тэніс. Камандны чэмпіянат Еўропы.
**11.30, 12.45** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны.
**12.55** Аўтагонкі. Суперкубак Porsche.
**18.45** Веласпорт. «Вуэльта»-экстра.
**20.00** Тэніс. US Open. Жанчыны. Пары. Фінал.
**23.00** Тэніс. US Open. Мужчыны. Фінал.

## Кінакамедыя

**0.00** Няхай жыве Францыя! (16+)
**1.35** Місія: неадэкватная (18+).
**3.05** Файны выкладчык (16+).
**5.00** Файны выкладчык-3 (18+).
**6.50** Стажор (16+).
**8.40** Каханне і іншыя катастрофы (12+).
**10.25** Энцыклапедыя разводаў (16+).
**12.00** Нянька па выкліку (16+).
**13.55** Пацучыныя бегі (12+).
**16.05** Эйс Вентура: вышук хатніх жывёл (12+).
**17.45** Эйс Вентура-2: калі кліча прырода (12+).
**19.30** Мамы (12+).
**21.30** З новым годам, мамы! (6+)
**23.05** Мамы-3 (12+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.50** Калекцыя Беларусьфільма. «Дзяржаўная граніца». Маст. фільм (12+).
**9.45** «Заўтра сёння» (12+).
**10.15** «Выратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+)
**11.05, 1.25** «Сіндром дракона». Серыял (16+).
**15.25** «Ён і яна» (16+).
**16.50** «Той, хто пабач». Маст. фільм (12+).
**20.35** «Без падману» (16+).
**21.30** «Асцярожна, махляры!» (16+)
**22.05** «Двайное жыццё Чарлі Санклаўда». Драма (16+).
**0.00** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**5.15** «Нераскрытыя тайны» (12+).

## ТБ1000

**6.10, 17.50** Мой хлопец — псіх (16+).
**8.55** Ультыматум Борна (16+).
**11.30** Немагчымае (16+).
**13.40** Шалёныя грошы Ккуры (16+).
**15.40** Бывай, дзетка, бывай (16+).
**20.10** Ілюзія падману-2 (12+).
**22.40** Эвалюцыя Борна (16+).
**1.15** Адплата (18+).
**3.45** Ідэнтыфікацыя Борна (12+).

## ТБ1000 Руская кіно

**7.50** Кухня ў Парыжы (12+).
**10.15** Ахоўвай мяне, мой талісман (12+).
**11.35** На краі стаю (16+).
**13.20** Вечнае жыццё Аляксандра Хрыстафорава (16+).
**15.25** Усё і адразу (16+).
**17.10** Шпіён (16+).
**19.15** Аднакласніцы: новы паварот (16+).
**20.45, 5.30** Пасля цябе (16+).
**23.05** Разбудзі мяне (18+).
**1.10** Кактэбель (12+).
**3.30** Апельсінавы сок (16+).

## National Geographic

**6.00** Навуковыя недарэчнасці (16+).
**6.25** Золата Юкана (16+).
**7.55, 1.20** Аўта-SOS (16+).
**9.30** Нацыянальныя святы (16+).
**10.20** Зона будаўніцтва (16+).
**11.10, 19.00, 22.15** Асушыць акіян (16+).
**12.40** Дзікі тунец (16+).
**14.20, 2.55** Цуды інжынерыі (16+).
**15.55** Унутры неверагоднай механікі (16+).
**16.40** 911: пажарная брыгада ў эпіцэнтры (16+).
**17.30** Самая доўгая вайна (16+).
**19.45** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**21.25** Небяспечныя падарожжы (16+).
**23.00** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**23.50** Гарачыя граніцы (16+).
**4.30** Пачатак (16+).
**5.20** Гульні розуму (16+).

## Discovery

**8.00, 9.20, 17.35** Як гэта зроблена? (12+)
**8.25, 16.40** Як гэта ўстроена? (12+)
**10.15** Залатая ліхаманка (16+).
**11.10** Джэрэмі Ўэйд: цёмныя воды (12+).
**12.05, 21.15** Дзікія эксперыменты (12+).
**13.00, 22.10** Скарбы карыбскіх піратаў (12+).
**13.55, 1.50** Голыя і напалоханыя (16+).
**14.50, 3.40** Ратавальнікі маёмасці (12+).
**18.30** Ланцуговая рэакцыя (12+).
**23.05** Склады (12+).
**0.00, 7.10** Паліцэйская камера (16+).
**0.55** Хуткія і гучныя (12+).
**2.45** Экстрэмальныя фургоны (12+).
**5.30** Вельмі каштоўныя аўто (12+).
**6.20** Іржавая імперыя (12+).

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

6.25 Слова мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на свята Раства Прасвятой Багародзіцы.
**6.35, 17.00 Меладрама «Смак шчасця» (16+).**
8.15 Клуб рэдактараў.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.20 «Арсенал» (12+).
9.55 Гісторыі выратавання (12+).
10.25 «Усе за стол!» (12+)
11.15 «На вылет!» (12+)
12.20 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.45 Меладрама «Каханне пад мікраскопам». 3-я і 4-я серыі (16+).**
14.25 Кулінарная дыпламатыя (12+).
15.25 Твой горад.
15.40 Вакол планеты.
16.25 Маршрут пабудаваны (12+).
20.40 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.
**22.10 Меладрама «Гаспадар дома» (16+).**

## Беларусь 2

**6.55 Серыял «Стаматолаг». Заключныя серыі (16+).**
8.30, 21.55 «Тэлебарометр».
8.35 М/с «Чарапашкі-ніндзя» (12+).
9.20 «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
10.15 «ЖаннаПажані» (16+).
**11.15 Трагікамедыя «Шоу Трумана» (12+).**
**12.55 Трылер «Клаверфілд, 10» (16+).**
14.40 «Тата папаў» (16+).
15.40 «Бітва экстрасэнсаў» (16+).
17.50 Хакей. Ліга чэмпіёнаў. «Тршынец» (Чэхія) — «Юнацтва-Мінск» (Беларусь).
20.20, 21.15 «Абмен жонкамі» (16+).
21.10 «Спортлато 5 з 36», КЕНО.
22.30 «Трэці лішні» (16+) [СЦ].
**23.50 Трылер «Саюзнікі» (18+).**

## Беларусь 3

7.35 «Святыні Беларусі».
8.00, 15.40, 20.15 Навіны культуры.
**8.20 «Кубанскія казакі». Камедыя (12+) [СЦ].**
10.00 «Наперад у мінулае».
10.30 «Беларуская кухня». Квасоліха.
11.00 «Сваімі словамі». Тэлевіктарына.
11.35 «Нацыянальны хіт-парад».
**12.30 «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан». Дэтэктыў (12+) [СЦ].**
14.45 «Майстры і куміры». Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Ганна Радзько.
15.55, 20.35 «Гэты дзень».
**16.00 «Вій». Маст. фільм (12+).**
17.15 «Дзесяць фатаграфій». Наталля Варлей (12+).
**17.55 «Адважнасць». Маст. фільм (12+).**
19.35 «Народны майстар». Юрый Адамовіч. «Традыцыіі злотнікаў».
20.00 «Архітэктура Беларусі».
20.40 «Калыханка» (0+).
**21.05 «Мачаха». Драма (12+) [СЦ].**
22.30 «Брэст. Тысячагадовы рубеж». Дак. фільм.

## Беларусь 5

6.20 Настольны тэніс. Камандны чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. 1/2 фіналу.
8.50 Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 1/2 фіналу.
10.25 Футбол. Кваліфікацыя да Еўра-2020. Літва — Украіна.
12.20 Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Іспанія — Беларусь.
13.20 Піт-стоп.
13.50 Настольны тэніс. Камандны чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Фінал.
14.50 Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. СКА-Мінск — БГК імя Мяшкова (Брэст).
16.40 Спорт-мікс.
16.50 Хакей. КХЛ. «Спартак» (Масква) — «Дынама-Мінск». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
19.20 Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Фінал.
21.45 Футбол. Кваліфікацыя да Еўра-2020. Швецыя — Нарвегія. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
23.45 Вынікі тыдня.
0.30 Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Плэй-оф.

## АНТ

7.00, 9.00, 16.00 (з субцітрамі) «Нашы навіны».
7.45 «Жыццё іншых» (12+).
8.40 «Метэагід».
9.10 «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
**9.25 Маст. фільм «Я буду побач» (16+).**
11.15 «Бачылі відзя?» (6+)
13.35 «Некалькі смешных хлопцаў» (16+).
15.00, 16.20 «Кропля ў кроплю» (16+).
18.20 «Эксклюзіў» (16+).
20.00 «Контуры».
21.05 «Вялікая гульня» (16+).
22.50 «Спартклуб» (16+).
23.10 «КВЗ». Прэм'ер-ліга. Фінал (16+).

## СТБ

6.00 «Дзіўная справа» (16+).
7.40, 11.05 Дакументальны спецпраект (16+).
9.15 «Мінтранс» (16+).
10.00 «Скардзіцца дазваляецца».
10.30 «Вялікі горад».
**12.20, 13.40, 16.40 «Мар'ін гай-2». Серыял (16+).**
13.30, 16.30 Навіны «24 гадзіны».
19.30 «Тыдзень».
20.35 «Засакрэчаныя спісы» (16+).
**22.55 «Старое ружжо». Серыял (16+).**
2.10 «Анекдот-шоу» (16+).

## МІР

6.00 «Мільён пытанняў аб прыродзе» (6+).
6.10 «Беларусь сёння» (12+).
6.40 М/ф (6+).
6.55 «Ведаем рускую» (6+).
7.50 «Культ/Турызм» (16+).
8.20 «Яшчэ танней» (12+).
8.55 «Сусветныя гульні розуму» (0+).
9.25 «ФазэндаЛайф» (6+).
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
**10.15, 16.15, 19.30 Серыял «Ганна Герман. Тайна белага анёла» (16+).**
18.30, 0.00 «Разам».
22.30 Начны экспрэс. Лайф (12+).
**1.00 Серыял «Бабін бунт, або Вайна ў Навасёлкаве» (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.00 Маст. фільм «Гэтым летам і назаўсёды» (12+).**
10.30 «Смехапанарама» Яўгена Петрасяна» (16+).
11.00 Весткі.
11.20 «Сто да аднаго» (12+).
12.15 «Ранішняя пошта» (16+).
13.00 «Калі ўсе дома» (12+).
14.00 «Смяяцца дазваляецца» (16+).
**16.10 Маст. фільм «Справа была ў Пянькове» (12+).**
**18.05, 21.45 Маст. фільм «Прыгожыя стварэнні» (12+).**
20.00 Весткі тыдня.
23.00 Масква. Крэмль. Пуцін.
23.40 «Вечар у нядзелю».

## НТБ—Беларусь

6.20 «Астрапрагноз».
6.25 Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
7.00, 22.35 «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
7.30 Іх норавы (0+).
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.20 Спецыяльны рэпартаж (12+).
8.40 «Аднойчы...» (16+)
9.20 «Хто ў доме гаспадар?» (16+)
10.25 «Першая перадача» (16+).
11.00 «Цуд тэхнікі» (12+).
11.55 «Дачны адказ» (0+).
13.00 «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.00 Маст. фільм «Багіні правасуддзя» (16+).**
16.20 «Следства вялі...» (16+)
18.00 «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
19.00 «Вынікі тыдня».
20.05 «Зоркі сышліся» (16+).
21.30 Ты не паверыш! (16+)
**23.05 Дэтэктыў «З жыцця начальніка крымінальнага вышуку» (12+).**

## 8 канал

7.00, 15.55, 18.40, 21.10, 23.25 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 М/ф «Легенды начных вартавых» (0+).
8.40 Дак. фільм «Дарога ў школу» (0+).
9.10 «Утрамдзія».
9.15 «Шлях АБІ» (6+).
9.40 «Гатуй як шэф» (12+).
10.00 «Вячэрні квартал-95» (18+).
**11.15 Фантастыка «Мсціўцы. Вайна бясконцасці».**
**13.45 Камедыя «Дзень выбараў» (16+).**
**16.00 «Глядзім усёй сям'ёй». Маст. фільм «Пачатак прыгод» (6+).**
**17.55 Серыял «Касл» (12+).**
18.45 «Рэальны бізнес» (6+).
**18.50 Камедыя «Як адчапіцца ад хлопца за дзесяць дзён» (12+).**
20.50 «Вечарніца» (0+).
**21.10 Трылер «Вялікая гульня» (16+).**



## ВТБ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.45, 13.10 М/ф «Цімон і Пумба» (0+).
8.10 «Лаві момант» (16+).
9.05 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
10.10 Travel-шоу «Турысты» (16+).
10.20 Серыял «Мамачкі» (16+).
11.15, 1.45 Серыял «Вароніны» (12+).
12.50 «Ералаш» (6+).
13.45 Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
1514.45 Фантастыка «Элізіюм: рай на Зямлі» (16+).
16.50 Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
17.55, 0.45 «Уральскія пельмені» (16+).
19.00 Серыял «Два бацькі і два сыны» (16+).
21.00, 5.10 Серыял «Псіхалагіні-2» (16+).
22.00 Прыгоды «Час першых» (12+).
3.05 Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).
4.25 Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Асабнякі Кекушава.
7.05, 20.05 «Правілы жыцця».
7.40 «Салодкае жыццё». Дак. фільм [СЦ].
8.25, 16.50 «Першакласніцы». Маст. фільм.
9.30 «Іншыя Раманавы». «Мой мілы сябар Сандра» [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 1.15 XX стагоддзе. «Квіток у дзяцінства». Фільм-канцэрт. 1969 год.
11.55 «Раман у камені». «Аўстрыя. Зальцбург. Палац Альтэнау». Дак. фільм.
12.20, 18.00, 0.30 «Улада факта». «Дыпламатыя напярэдадні Другой сусветнай вайны».
13.05 75 гадоў Аляксандру Філіпенку. «Лінія жыцця» [СЦ].
14.00 «Дарога на «Маяк». Плутоній для рускай бомбы». Дак. фільм.
15.10 «Ален Дэлон. Партрэт незнаёмца». Дак. фільм.
16.10, 2.00 «Інтэрнэт палкоўніка Кітова». Дак. фільм.
18.45 «Даведнік па аркестры Юрыя Башмета». Дак. серыял. 1-я серыя.
19.45 Галоўная роля.
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 Ступені цывілізацыі. «Восем дзён, якія стварылі Рым». Дак. серыял. 1-я серыя [СЦ].
21.30 «Сацi. Нясумная класіка...»
22.10 «Канец парада». Серыял. 1-я серыя (16+).
23.10 «Маналог у 4 частках. Ніна Усатава». Частка 1-я [СЦ].
0.00 «Магістр гульні». «Скон Еўропы: прароцтва ці памылка ў перакладзе?» [СЦ].
2.40 Колер часу. Караваджа.

## Настальгія

6.00 Дак. фільм «Аўтапартрэт» (16+).
6.50 Тэлеспектакль «Дарога на Чатанугу». 1992 год (12+).
9.00 «Быў час» (16+).
10.00 Фільм-канцэрт «Рок». 1987 год (18+).
11.20, 15.45, 19.05, 21.45, 23.00, 3.45, 5.00 Музычная настальгія (12+).
12.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
13.05 «Вакол смеху». Бенефіс пісьменніка Сямёна Альтава. 1990 год (12+).
14.20 Канцэрт «Sixties Soft Rock». 2004 год (12+).
15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
16.00 «Дзве гадзіны з бардамі». 1987 год (12+).
18.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Маладзёжная рэвалюцыя 1960-х». 2005 год (18+).
19.20 Фільм-спектакль «Тапаз». 1976 год (16+).
0.10 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1977-ы. 4-я частка. 2009 год (12+).
1.05 Маст. фільм «Тры рублі» (12+).
1.30 «Вакол смеху». «Атэлье гумару». 1983 год (12+).
4.00 Колба часу «(16+).

## EuroSport 1

0.00, 2.15, 6.00, 10.00, 17.50, 22.15 Тэніс. US Open.
2.00, 21.00 Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс».
8.00, 13.00 Веласпорт. «Вуэльта».
9.30 Аўтагонкі. Суперкубак Porsche.
12.00, 16.30 Алімпійскія гульні. «Жывыя легенды».
12.30 Алімпійскія гульні. Camps to Champs.
13.30 Аўтагонкі. World Endurance.
14.30 Веласпорт. Класіка.
16.00 Watts.
16.40 Веласпорт. «Тур Германіі».
17.15 «Дух паруснага спорту».

## Кінакамедыя

0.30 Рок-дог (6+).
2.40 Дзень выбараў (16+).
5.15 Дзень выбараў-2 (12+).
7.20 Будзь маім хлопцам на пяць хвілін (16+).
9.00 Файны выкладчык (16+).
11.20 Файны выкладчык-3 (18+).
13.40 Пацучыныя бегі (12+).
15.45 Місія: неадэкватная (18+).
17.30 Дастаць карантышку (16+).
19.30 Эйс Вентура: вышук хатніх жывёл (12+).
21.10 Эйс Вентура-2: калі кліча прырода (12+).
22.55 Зноў у школу (16+).

## ТБ3

6.00 М/ф (6+).
8.15 «M&S» (12+).
8.45 Калекцыя Беларусьфільма. «Дзяржаўная граніца». Маст. фільм (12+).
10.40 «Перыскоп» (16+).
11.00, 4.15 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
12.40 «Асцярожна, махляры!» (16+)
13.15 «Без падману» (16+).
14.10 «Каханне з усімі прыпынкамі». Маст. фільм (16+).
15.55, 23.05 «Нераскрытыя тайны» (12+).
16.35 «Мой герой» (12+).
17.25 «Развітанне» (16+).
18.25 «Ільф і Пятроў. Тайны 12 крэслаў». Дак. фільм (12+).
19.20, 2.45 «Парфумерка-2». Серыял (12+).
21.15 «Пад купалам». Серыял (16+).
0.00 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
0.45 «Прыгажунчык-2». Камедыя (18+).
5.05 «Часова даступны» (12+).

## TV1000 ТБ1000

6.10 Рок Дог (6+).
8.05 Д'ябал і Дэніэл Уэбстэр (16+).
10.05 Ілюзія падману (12+).
12.15 Сіняя бездань (16+).
14.00 Код да Вінчы (16+).
16.50 Дзявяткі (16+).
18.40 47 ронінаў (12+).
21.00 Дракула (16+).
23.25 Джон Уік-2 (18+).
1.50 Зламі таўстуху, калі зможаш (16+).
3.45 Анёлы і дэманы (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

7.35 Аднакласніцы (16+).
9.10 Настаўніца (12+).
11.50 Пацыенты (16+).
13.35 Вечны водпуск (16+).
14.35 Паляўнічы-2. Мыцішчанскі маньяк (16+).
16.50 14+ (16+).
19.05 Выратаваць Пушкіна (6+).
20.45, 5.30 Галоўны (6+).
22.50 Прайгранае месца (16+).
0.45 Вяселле (16+).
3.20 Падсадны (16+).

## National Geographic

6.00 Зона будаўніцтва (16+).
6.25 Найбуйнейшы ў свеце рамонт (16+).
7.15, 19.45, 5.15 Скануючы час (16+).
8.00 Ледзяная дарога (16+).
8.45, 13.30 Інстынкт выжывання (16+).
9.30, 12.45 Асушыць акіян (16+).
10.20, 16.40 Суперкар са сметніка (16+).
11.05 Дзікі тунец (16+).
14.20 Цуды інжынерыі (16+).
15.05, 21.20, 2.50 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.55 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
17.25 Апошнія крокі Гітлера (16+).
18.10, 22.05, 0.25, 3.40 Тайная гісторыя (16+).
20.30 Рэальнасць ці фантастыка? (16+)
22.50 Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
23.40 Ліхтугі за мяжой (16+).
1.15 У пагоні за НЛА (16+).
2.00 Мяжа (16+).
4.25 Аўта-SOS (16+).

## Discovery

8.00, 11.10, 14.50, 21.15 Як гэта зроблена? (12+)
8.25, 18.30, 1.50 Залаты шлях Паркера Шнабеля (16+).
9.20, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
10.15, 17.35, 0.00, 4.35 Хуткія і гучныя (16+).
12.05, 23.05 Склады (12+).
13.00, 3.40 Аляска: сям'я з лесу (16+).
13.55 Як гэта ўстроена? (12+)
19.25, 7.10 Чыгунка Аляскі (16+).
20.20, 5.30 Паляўнічыя на старызну (12+).
0.55, 6.20 Выжыванне без купюр (16+).
2.45 Голыя і напалоханыя (16+).

# БУДУЧАГА



малодшыя, сярэднія, старэйшыя знаходзяцца адно ад аднаго на бяспечнай адлегласці, яны ўсе займаюцца асобна, і гэта таксама зручна. Абсталяванне ўсё новае і сучаснае — гімнастычныя маты, страхоўкі і гэтак далей. Усім гэтым школа цалкам укамплектаваная. Збудаванне ў цэлым бяспечнае і для вучняў, і для абслуговага персаналу. Праекціроўшчыкі і будаўнікі гэта ўлічылі і, спадзяёмся, зрабілі максімальна бяспечным знаходжанне ў ёй.

Каб я ўразілася да канца, спецыяльна для мяне арганізуюць выхад на дах. Там таксама ўсё ідэальна — маланкаадводы, вентыляцыйнае абсталяванне, высокія борцікі. Зверху мясцовасць выглядае не менш прывабна.

Пакуль на тэрыторыі мала зеляніны, але гэта пытанне часу. Нядаўна 30 маладых педагогаў, якія пачнуць сваю работу ў магілёўскіх школах, высадзілі туі.

Да пачатку новага навучальнага года засталося ўсяго два дні. Школа № 46 разлічана на 1020 чалавек, за яе парты сядзе 700 вучняў. Дзякуючы новай школе нарэшце з палёгкай уздыхне суседняя, 19-я, якая літаральна трашчала па швах, абслугоўваючы ўвесь вялікі мікраён Казіміраўкі. Дарэчы, для навучэнцаў 19-й школы прыемным падарункам стане яшчэ і новая спартыўная пляцоўка.

А будаўніцтва ў школе № 46 будзе працягвацца. Другая чарга — стварэнне басейна.

— Мы ведаем, наколькі важныя гэты аб'ект для Магілёва, — канстатуе глава адміністрацыі. — Будаўніцтва школы вялося і працягвае весціся пад пільным наглядам кіраўніцтва вобласці і горада.

Дарэчы, мікраён, дзе з'явілася школа, малады і перспектыўны. Тут будуецца жыллё для шматдзетных і маладых сем'яў. І, што асабліва прыемна, з нацыянальнай адметнасцю. Нават назвы вуліц кажуць самі за сябе: Цішкі Гартнага, Грунвальдская, Льва Сапегі...

**Як растлумачылі ў Магілёўскім абласным упраўленні фінансава-гаспадарчага забеспячэння ўстаноў адукацыі,** на рамонт устаноў адукацыі ў вобласці сёлета накіравана 14,5 мільёна рублёў. За кошт сродкаў Сусветнага банка адрамантавалі Мурынборскі вучэбна-педагагічны комплекс у Касцюковіцкім раёне і гімназію ў Глуску. Плануецца набыццё 24 школьных аўтобусаў і яшчэ васьмі для перавозкі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Умацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база харчаблокаў, закупляецца новая мэбля, спартыўнае абсталяванне, даводзяцца да ладу спартыўныя пляцоўкі і стадыёны. Прыкладам таго, што нават у аддаленых ад абласнога цэнтра вёсках ствараюцца добрыя ўмовы для адукацыі дзяцей, служыць вучэбна-педагагічны комплекс у вёсцы Мурын Бор. У сельскай мясцовасці зрабілі практычна новую сучасную школу. Яна перспектыўная, і яе перавагамі зможа скарыстацца вялікая колькасць дзяцей. Пытанні бяспекі для ўстаноў адукацыі заўсёды стаяць на першым месцы. Праводзяцца планавыя восеньскія і веснавыя агляды ўласнікамі будынкаў, камісіямі гар-, райвыканкамаў з прыцягненнем спецыялістаў будаўнічых устаноў, упраўленняў капітальнага будаўніцтва, арганізуюцца камісійныя праверкі ўстаноў адукацыі. Згаданыя аб'екты дасканала правяраліся пры падрыхтоўцы да новага навучальнага года камісіямі з удзелам прадстаўнікоў гар-, райвыканкамаў, санітарных урачоў, прадстаўнікоў МНС, энергетыкаў. Пашпарты гатоўнасці выдаваліся толькі тады, калі не ўзнікала ніякіх пытанняў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**



# бяспека дзяцей

ствараюць пагрозы жыццю і здароўю дзяцей, выяўлена не было, — канстатуе спецыяліст. — Але гэта не нагода для самазаспакаення. Работа над узмацненнем унутрыведамаснага кантролю па захаванні патрабаванняў бяспекі і павышэнні кваліфікацыі службовых асоб павінна быць пастаяннай.

З 9 да 10 верасня ў межах Адзінага дня бяспекі ва ўсіх школах будуць адпрацаваны планы эвакуацыі на выпадак узнікнення пажару. У верасні ва ўсіх школах супрацоўнікі МНС паўдзельнічаюць у класных гадзінах, дзе нагадаюць дзецям правілы пажарнай бяспекі.

Як адзначыла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі — начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына КАРЖОВА,** пашпарты гатоўнасці падпісаны амаль усім школам. Мясцовыя выканаўчыя органы ўлады правялі мерапрыемствы, якія датычацца прыёмкі школ. Спецыяліст падкрэсліла, што гэта не фармальная працэдура: на месцах ствараліся камісіі, куды акрамя спецыялістаў сістэмы адукацыі ўваходзілі супрацоўнікі МНС і санітарна-эпідэміялагічных службаў.

— Гэта не толькі праверка завяршэння рамонтных работ, а найперш маніторынг бяспечных умоў для арганізацыі адукацыйнага працэсу, — падкрэсліла Ірына Каржова.

У гэтым навучальным годзе ў 3003 школах за парты сядзе 1 мільён 30 тысяч вучняў. З іх 115 тысяч — першакласнікі. У сельскай мясцовасці каля 70 тысяч дзяцей да месца навучання будуць падвозіць больш чым 1630 школьных аўтобусаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

ДАШКОЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ

# НЕ АБАВЯЗКОВАЯ, АЛЕ ЗАПАТРАБАВАНАЯ

У 2019/2020 навучальным годзе каля 456 тысяч дзяцей будуць наведваць больш за тры тысячы ўстаноў дашкольнай адукацыі. Плануецца пабудаваць 79 устаноў на 14 тысяч месцаў, стварыць каля 450 груп кароткачасовага знаходжання дзяцей. Аб гэтым расказала **кансультант упраўлення дашкольнай адукацыі галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Любоў ГАРЭЛАВА:**

— У прыярытэце для нас — якасць дашкольнай адукацыі і яе даступнасць для розных катэгорый дзяцей. Колькасць малых ва ўзросце ад трох да шасці гадоў, якія наведваюць дзіцячыя садкі, штогод расце: у 2015 годзе паказчык складаў 94,7 працэнта, у 2019-м — больш за 96 працэнтаў. Пры гэтым дашкольная адукацыя ў нас не з'яўляецца абавязковай. Не даюцца месцы каля 6,5 тысячы дзяцей па ўсёй краіне. Складана ў асноўным у мікрараёнах, дзе ідзе актыўнае будаўніцтва і ўвод новага жылля, у буйных абласных цэнтрах, раёнах і мікрараёнах Мінска, дзе таксама ўзводзіцца сацыяльнае жыллё. Калі мы гаворым пра дашкольную адукацыю, то дзеці могуць атрымаць яе ва ўстановах рознага тыпу: у дзяржаўных дзіцячых садках, санаторных установах агульнай сярэдняй адукацыі, у прыватнасці, вучэбна-педагагічных комплексах, і іншых. Альтэрнатывай дзяржаўным з'яўляюцца ўстановы прыватнай формы ўласнасці: у 2018/2019 навучальным годзе ў краіне такіх функцыянавала 12, адукацыю ў іх атрымлівалі 357 дзяцей.

Супрацоўніца Міністэрства адукацыі адзначыла, што ў перыяд з 2015 да 2018 года створана каля 34 тысяч дадатковых месцаў для дзяцей дашкольнага ўзросту, з якіх каля 10 тысяч — за кошт уводу ў эксплуатацыю 53 устаноў дашкольнай адукацыі. Каб бацькі змаглі своечасова выйсці на работу пасля дэкрэтнага водпуску, а іх дзеці атрымаць якасную дашкольную адукацыю, ёсць магчымасць выбраць час знаходжання малых у садку: 10,5 гадзіны, 12 або кругласутачнае знаходжанне. Карыстаецца попытам і кароткачасовае знаходжанне дзяцей у садках (ад дзвюх да сямі гадзін).

**Галоўны спецыяліст аддзела дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Алена МАКАРЭВІЧ** адзначыла, што ў гэтым навучальным годзе плануецца павелічэнне колькасці месцаў ва ўстановах дашкольнай адукацыі.

— Мы даём іх усім, хто мае патрэбу, але часта яны знаходзяцца не ў крокавай даступнасці ад дому або работы бацькоў, таму некаторыя адмаўляюцца ад месцаў. Да 2023 года ў сталіцы будзе пабудавана дадаткова 20 садкоў, што вырашыць праблему недахопу месцаў ва ўстановах дашкольнай адукацыі. На сёння назіраецца тэндэнцыя арганізацыі груп дзяцей да аднаго года або двух гадоў. Развіваецца сетка груп лячэбнага знаходжання, а таксама адаптацыйных, дзе адукацыя вядзецца з дзіцем па розных кірунках. Ёсць цікавасць да арганізацыі беларускамоўных груп дзяцей, якія збіраюцца па жаданні бацькоў: у 2018/2019 навучальным годзе іх было 144, у 2019/2020 годзе чакаецца 148. Існуюць і школы для матуль, дзе яны і іх дзеці могуць атрымаць дапамогу ад патрэбных спецыялістаў. Акрамя таго, у сталіцы арганізавана работа спецыяльных дзіцячых аўтобусаў «Малыш» ці «Малышок», з дапамогай якіх малыя могуць даехаць да свайго садка, — паведаміла спецыяліст.

Асноўная тэндэнцыя ў дашкольнай адукацыі на сёння — інклюзіўнае навучанне. У краіне функцыянуе 47 устаноў спецыяльнай дашкольнай адукацыі: у Мінску — 13, у Брэсцкай вобласці — шэсць, у Віцебскай — чатыры, у Гродзенскай — восем, у Гомельскай — 13, у Магілёўскай — дзве, Мінскай вобласці — адна. Пра гэта расказала **галоўны спецыяліст профільнага ўпраўлення адукацыі Міністэрства адукацыі Алена МУЛІЦА:**

— Яны ахопліваюць катэгорыі дзяцей з парушэннямі апорна-рухальнага апарату, псіхічнага развіцця, слыху, зроку і іншых. Функцыянуе шырокая сетка груп інтэграванага навучання і выхавання — больш за 1200, сацыяльных груп на базе спецыяльнага школьнага навучання — каля 600. Такая форма адукацыі вельмі запатрабаваная сярод бацькоў. З кожным годам павялічваецца колькасць устаноў спецыяльнай дашкольнай адукацыі для дзяцей з асаблівасцямі развіцця, працэнт развіцця адаптыўнага безбар'ернага асяроддзя на сёння складае прыкладна 40 працэнтаў.

> Ёсць цікавасць да арганізацыі беларускамоўных груп дзяцей, якія збіраюцца па жаданні бацькоў: у 2018/2019 навучальным годзе іх было 144, у 2019/2020 годзе чакаецца 148.

**Намеснік начальніка аддзела дашкольнай, агульнай сярэдняй, прафесійнай тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінаблвыканкама Антаніна АБАЛЕВІЧ** адзначыла, што атрыманне дашкольнай адукацыі ў 2019/2020 годзе па Мінскай вобласці будуць забяспечваць 662 установы адукацыі, у якіх залічана больш за 63 тысячы дзяцей.

— Па краіне выконваюцца сацыяльныя дзяржаўныя стандарты — 89,5 працэнта дзяцей атрымліваюць дашкольную адукацыю, аднак па-ранейшаму застаецца адкрытым пытанне забеспячэння месцамі ў Мінскім раёне — толькі 64 працэнтаў хлопчыкаў і дзяўчынак залічаны тут у дзіцячыя ўстановы. З мэтай павелічэння колькасці месцаў у 2018 годзе ў краіне было створана 1200 дадатковых, з іх 530 за кошт дзяржаўнага бюджэту.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

ЦІКАВАЯ ПРАПАНОВА

# БОНУС ДЛЯ ВЫДАТНІКАЎ

## У Гродне дэпутаты прапануюць выдаваць у маршрутках «нулявы» білет

**Вучні-выдатнікі змогуць ездзіць у маршрутных таксі бясплатна. З такой прапановай выступілі дэпутаты Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў. Ініцыятыву гатовы падтрымаць і фірмы-перавозчыкі. Каб ездзіць бясплатна, школьнікі павінна па ўсіх прадметах за чвэрць мець толькі «дзявяткі» і «дзясяткі».**

### Адкуль ідэя?

Задзейнічаць у бясплатнай перавозцы маршрутныя таксі прапанаваў **дэпутат гарадскога Савета, старшыня камісіі па пытаннях сацыяльнай сферы, справах моладзі і ветэранаў Сяргей МАЗАЙЛА.** Ён расказаў, што даведаўся аб такой ініцыятыве з расійскіх тэлеканалаў. І падумаў: а чаму не зрабіць такі ж бонус для гродзенскіх школьнікаў?

> Аказалася, што выдатнікаў у Гродне ні многа, ні мала — каля тысячы чалавек.

— У Расіі выдатнік паказаў дзённік — і едзе бясплатна. Я сабраў прадстаўнікоў фірмаў-перавозчыкаў і кажу: ёсць ідэя. Але гэта вашы грошы — хочаце вазіце, хочаце — не, — кажа дэпутат.

Школьнікаў бясплатна возіць гарадскі грамадскі транспарт. Да таго ж, усіх. Такая ўстаноўка дзейнічае па ўсёй краіне, але на месцах усё роўна павінны прымацца адпаведныя рашэнні, прычым на ўзроўні абласнога Савета дэпутатаў. Таму што бюджэт, за які адказваюць дэпутаты, кампенсуе транспартнікам затраты на праезд вучняў. Такім чынам, школьнікі ездзяць бясплатна з верасня да ліпеня. Яны павінны мець толькі завераную ў школе даведку з фотаздымкам. Што датычыцца перыяду ліпеня—жніўня, кошт для бюджэту атрымаўся даволі значны, таму ў Гродне было прынята рашэнне зрабіць бясплатны праезд толькі тым, хто наведвае дзённыя летнікі. На гэтыя мэты з бюджэта выдаткавана 16 тысяч рублёў.

А вось маршрутчыкам ніхто нічога кампенсаваць не будзе. Больш за тое, яшчэ і пакараць могуць за безбілетны правоз. Напрыклад, спыняе іх падатковая інспекцыя: дзе білет у пасажыра? Няма, маўляў, едуць бясплатна. Значыць, штраф. Павінен быць «нулявы» білет. Гэта свайго роду страхоўка для пасажыра. Калі няма ніякага білета, значыць пасажыр не застрахаваны, а гэта парушэнне заканадаўства. Дарэчы, так званыя «нулявыя» білеты існуюць для некаторых катэгорый грамадзян. Па іх таксама прымаюцца адпаведныя рашэнні абласным Саветам дэпутатаў.

### Каго павязуць?

Аказалася, што выдатнікаў у Гродне ні многа, ні мала — каля адной тысячы чалавек. Дэпутаты падлічылі, што з першага да чацвёртага класа дзяцей, як правіла, возяць бацькі. 10 і 11 класы — ужо дарослыя, яны будуць самі плаціць. Вызначыліся, што бясплатна паедуць толькі сярэднія школьнікі з 5 па 9 класы. Такім чынам набралася дзесьці 600 чалавек. Гэта толькі тыя, хто мае «дзявяткі» і «дзясяткі» ва ўсіх чвэрцях.

— Выказваліся прапановы наконт таго, чаму менавіта выдатнікам трэба дапамагаць? А чаму ім не паспрыяць? — задаецца пытаннем Сяргей Мазайла. — Дзеці працуюць, выкладваюцца, я сам бачу, калі прысутнічаю на конкурсах у журы. Там сапраўды ўзровень, гэта наша будучая эліта, і няхай яна атрымае невялікі падарунак ад горада.

Вядома, тыя ж выдатнікі могуць бясплатна ездзіць і на грамадскім транспарце, а маршруткі для іх — свайго роду бонус за выдатную вучобу.




Як адрозніць выдатнікаў? Ім, па словах дэпутата, выдадуць адпаведныя даведкі. Праўда, спачатку прапаноўвалася зрабіць, як у Расіі — паказваць кіроўцу дзённік. Але гэта будзе зацягваць паездку, да таго ж, ёсць верагоднасць, што дзеці могуць карыстацца чужымі дзённікамі. Таму з'явіцца даведка з фотаздымкам і завераная школьнай пячаткай. Калі ў звычайнага школьніка такая даведка адна — толькі на праезд у гарадскім транспарце, у выдатнікаў іх будзе дзве — яшчэ і для праезду ў маршрутках.

### Перавозчыкі згодны, але...

Як высветлілася, тэма для многіх даволі няпростая. У гутарцы прадстаўнікі фірмаў-перавозчыкаў прызналіся, што пакуль не ўяўляюць сабе гэты працэс у поўнай ступені. У прыватнасці, як перавозіць выдатнікаў пры наплыве пасажыраў? Зразумела, што перавага будзе аддавацца менавіта ім, а не школьнікам з «нулявымі» білетамі.

Таксама ўзнікае пытанне: як быць, калі ў маршрутку зойдзе адразу некалькі выдатнікаў? Для перавозчыкаў такая сітуацыя пагражае стратамі. Тым больш што ездзіць такім дзецям будзе дазволена цэлы дзень.

— Многія кіроўцы бяруць школьнікаў і вязуць бясплатна, нягледзячы на тое, выдатнік ён ці не. Некаторыя дзеці кажуць, што грошай няма, маўляў, падвязіце два прыпынкі, мы не адмаўляем. Але калі сёння аднаго школьніка бярэш, заўтра іх ужо цэлы натоўп стаіць... Ці не спрыяе гэта ўтрыманству? Ды і даведку, я лічу, праз інтэрнэт зрабіць нескладана, — лічыць перавозчык Сяргей.

Па яго словах, у сітуацыі з бясплатнай перавозкай нямала падводных плыняў. Напрыклад, як частa вучань павінен пацвярджаць, што ён выдатнік? Як будзе выглядаць даведка? Яна будзе агульнага ўзору ці не? З гэтымі пытаннямі павінны разабрацца дэпутаты. Неабходна таксама далучыць да размовы ўсіх перавозчыкаў, растлумачыць ім усё падрабязна. Пакуль у маршрутчыкаў нямала пытанняў наконт новай ідэі. Напрыклад, ці ўсе будуць вазіць выдатнікаў, ці толькі некаторыя маршрутныя таксі?

Як паведаміў Сяргей Мазайла, рашэнне яшчэ патрабуе нямала ўзгадненняў. Каб яго прыняць, трэба абысці не адзін кабінет, а можа, з дзясятак. І толькі пасля гэтага пытанне будзе выносіцца на разгляд сесіі абласнога Савета дэпутатаў. Як хутка ўсё завершыцца, пакуль невядома. Верагодней за ўсё, гэтая ініцыятыва пачне працаваць з наступнай, другой чвэрці.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

**Каментарый дэпутата**

**Алена АЛЯХНОВІЧ, дырэктар школы № 28 горада Гродна, дэпутат гарадскога Савета дэпутатаў:**

— Што датычыцца зайздрасці з боку іншых вучняў, можна адказаць так: а што ім перашкаджае вучыцца добра? Некаторыя проста не прыкладаюць для гэтага дастаткова намаганняў, таму і не могуць разлічваць на прывілеі.

Наш педагагічны калектыў вельмі станоўча ставіцца да гэтай ініцыятывы. Ідэю падтрымалі і бацькі. Лічым, што гэта будзе спрыяць яшчэ большай паспяховасці вучняў. Гэта здаровы, нармальны стымул. Як у кожнай рабоце — чым лепш чалавек працуе, тым у яго больш шанцаў на матэрыяльныя заахвочванні. Лічу, што гэтую катэгорыю выдатнікаў можна было б пашырыць і ўключыць сюды пераможцаў абласных і рэспубліканскіх алімпіяд, кандыдатаў і майстроў спорту. Перамогі, якія яны прыносяць, вельмі значныя.

# РАЗМЕТКА КАЛЯ ШКОЛ

## Аб правілах бяспечных паводзін на дарозе напярэдадні новага навучальнага года напамінаюць супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі

**У Гомелі прафілактычная акцыя «Бяспечная дарога ў школу!» стартавала на плошчы Паўстання. Там інспектары ДАІ ўручалі школьнікам — пасажырам транспартных сродкаў канцылярскія прылады. Пеналы, наборы алоўкаў, альбомы, а таксама святлоадбівальныя элементы і тэматычныя памяткі пра бяспеку дарожнага руху абавязкова спатрэбяцца дзецям на працягу навучальнага года. Адначасова з малымі і дарослымі праводзіліся прафілактычныя гутаркі аб правілах паводзін на дарозе.**

**Інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС Гомельскай вобласці Дар'я СМАЛЯК** расказала, што каля адной з вялікіх крамаў у абласным цэнтры прайшла сумесная акцыя Дзяржаўтаінспекцыі, Савецкай раённай арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа і навучэнцаў школы № 43:

— Падчас правядзення інфармацыйна-прафілактычнай акцыі «Па дарозе ў школу» школьнікі не толькі ўручалі мінакам памятку пра асновы бяспекі на дарозе, але і прапаноўвалі адказаць на некалькі пытанняў вікатрыны. Усе, хто хацеў, маглі пакінуць на стэндзе свае пажаданні ўдзельнікам дарожнага руху. Дарэчы, і тут былі падарункі: шарыкі з парадамі і флікеры.

Цяпер у абласным цэнтры праходзіць акцыя Дзяржаўтаінспекцыі «Бяспечная дарога ў школу!». На працягу тыдня супрацоўнікі ДАІ кантралююць перавозку дзяцей у аўтамабілях. Тым кіроўцам, што перавозяць дзяцей без парушэнняў і з выкарыстаннем утрымліваючых прылад, дораць сувенірную прадукцыю, а маленькім пасажырам — канцылярскія прылады да школы.



Між тым супрацоўнікі ДАІ Гомельшчыны на патэнцыйна небяспечных пешаходных пераходах, а таксама каля ўстаноў адукацыі ініцыявалі нанясенне дарожнай разметкі, якая павінна садзейнічаць псіхалагічнаму стрымліванню хуткасці руху транспартных сродкаў.

Цяпер каля школы № 72 па вуліцы Галавацкага ў Гомелі і побач з Азершчынскай школай № 1 у Рэчыцкім раёне праезная частка візуальна звужаецца. Такая мера таксама змяншае верагоднасць несанкцыянаванай паркоўкі транспартных сродкаў бліжэй чым за 15 метраў ад пешаходных пераходаў. Хутка аналагічная разметка з'явіцца і на вуліцы Карповіча, каля сярэдняй школы № 11 у Гомелі, а таксама побач з некаторымі школамі ў Мазыры.

Акцыя «Бяспечная дарога ў школу!» падоўжыцца да 31 жніўня, а ўжо 2 верасня супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі прымуць удзел ва ўрачыстых лінейках, прысвечаных новаму навучальнаму году. Вядома ж, яны не толькі павіншуюць школьнікаў са святам, але і нагадаюць пра самыя галоўныя правілы бяспекі на дарозе.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота атрымана ад прэс-службы УДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама.**

# ГУЛЬНІ З НАСТУПСТВАМІ

**Усё часцей дзіцячыя пляцоўкі з месца для адпачынку ператвараюцца ў нагоду для спрэчак, самыя сур'ёзныя з якіх даходзяць да судоў. Справа ў тым, што значна ўзрасла імавернасць атрымаць траўму падчас гушкання на арэлях ці катання з горкі. Заклапочаныя бацькі задаюць справядлівыя пытанні: наколькі небяспечныя ў наш час дзіцячыя пляцоўкі і хто павінен кантраляваць іх стан?**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## Упаў, ачуўся, гіпс

Па статыстыцы, са 100 тысяч беларускіх дзяцей 8-10 тысяч атрымліваюць траўмы на дзіцячых пляцоўках. Лічба немаленькая. Асабліва калі мець на ўвазе, што гэтыя самыя пляцоўкі ствараюцца ў першую чаргу для бяспекі: не было б іх, увогуле невядома, куды б малыя лезлі ў вольны час. Але, як паказвае практыка, не ўсё так адназначна.

Чатыры гады таму дзве сталічныя школьніцы трапілі ў бальніцу акурат з дзіцячай пляцоўкі. Падчас гульні на іх упала бетонная арка. Абедзве дзяўчынкі атрымалі пераломы і, вядома, вельмі напужаліся. Ніхто нават і ўявіць не мог, што двор, на якім яны рабілі яшчэ свае першыя крокі, паднясе такі «сюрпрыз». Ці яшчэ адзін прыклад: мінулай вясной васьмігадовы хлопчык траўміраваўся на каруселі — нагу заціснула настолькі, што давялося рабіць дзве аперацыі, каб ён зноў мог хадзіць. Маці школьніка была ўпэўненая ў вінаватасці камунальнікаў, якія не выявілі няспраўнасць гульнявога абсталявання, і напісала заяву ў міліцыю. У сваю чаргу, супрацоўнікі жыллёва-эксплуатацыйнай канторы даказвалі, што карусель была ў парадку. Ва ўсялякім выпадку, гэта зафіксавалі праваахоўныя органы. У выніку адказнасць за сітуацыю ніхто на сябе так і не ўзяў, кожны застаўся пры сваім меркаванні. Але ці павінна так быць?

У Беларусі дзейнічае адзіны дзяржстандарт, які прадугледжвае выраб, установку і эксплуатацыю абсталявання для дзіцячых гульнявых пляцовак. Фактычна адказнасць за пляцоўкі нясе тая арганізацыя, якая займаецца абслугоўваннем прыдамавой тэрыторыі. Як правіла, гэта жыллёва-эксплуатацыйная ўстанова. У адным толькі Мінску больш за чатыры тысячы пляцовак, якія змяшчаюць каля 27 тысяч адзінак гульнявога і спартыўнага абсталявання, знаходзяцца на абслугоўванні гарадской жыллёвай гаспадаркі. Аднак ёсць пляцоўкі, што належаць таварыствам прыватнікаў, і тады адказнасць ляжыць на іх. У стандарце прапісана, што кантроль за гульнявым і спартыўным абсталяваннем павінен ажыццяўляцца штодзённа. Напрыклад, падчас уборкі дворнікамі. Больш дэталёвая праверка (у тым ліку і на трываласць) прадугледжана раз на 1-3 месяцы супрацоўнікамі ЖЭУ. Двойчы на год — восенню і вясной — адбываюцца планавыя агляды спецыяльнымі камісіямі.

Акрамя таго, штогод у адмысловыя рэйды па дзіцячых пляцоўках адпраўляецца пракуратура. Перад пачаткам летніх вакацый яе прадстаўнікі абыходзяць выпадкова абраныя пляцоўкі і правяраюць, наколькі яны падрыхтаваныя да сезона. Вынік — нязменныя прадпісанні з патрабаваннямі неадкладна прывесці ў належны стан гульнявое абсталяванне ці заняцца санітарным станам месца.

## Любіш катацца? Любі і за пляцоўкай назіраць

Будзем рэалістамі: далёка не ўсе камунальнікі настолькі дысцыплінаваныя, каб штодзень правяраць, ці не здарылася чаго-небудзь з арэлямі за ноч. Нельга выключаць чалавечы фактар — няспраўнасць можна проста не заўважыць. Да таго ж дзіцячыя пляцоўкі час ад часу «акупуюць» зусім не тыя, для каго яны прызначаныя. Гэта і таварышы з бутэлькамі піва ці чаго мацнейшага, і падлеткі, якім рукі свярбяць што-небудзь зламаць. Таму адзінае, што можна параіць бацькам: калі адпраўляеце дзяцей адных у двор, самі спачатку пераканайцеся, што там усё нармальна.

Інтэрактыўная карта на сайце 115.бел, які створаны для паляпшэння жыллёва-камунальных паслуг у гарадах краіны, штодзень папаўняецца дзясяткамі прэтэнзій менавіта ад матуль і татаў. «Дзе сядушка на арэлях? Дзеці калыхаюцца на голым жалезе!», «Дзірка ў пластыкавай горцы. Сын рэгулярна прыходзіць дадому ў падраных штанах. Зрабіце што-небудзь», «Калі прывараць турнікі? Яшчэ некалькі тыдняў у такім стане — і яны ўпадуць каму-небудзь на галаву», — пішуць бацькі. За выпраўленнем недахопаў можна сачыць у рэжыме анлайн. Зручна. Але самае важнае — тут праблемы сабраныя і выкладзеныя ва ўсеагульны доступ. Так бы мовіць, адзін заўважыў і папярэдзіў усіх астатніх.

## Забавы не па дзяржстандарце

У 2015 годзе героем срodкаў масавай інфармацыі стаў звычайны пенсіянер з вёскі Агароднікі, што ў Лідскім раёне. Мужчына сваімі рукамі змайстраваў насупраць дома шыкоўны спартыўна-забаўляльны комплекс, якому маглі б пазайздросціць многія гараджане. Валейбольная і танцавальная пляцоўкі, арэлі і турнікі на любы густ, з'явілася нават горка, з якой можна было спускацца ў самаробны басейн. І ўсё гэта на маляўнічым беразе Нёмана. Дзецям з навакольных вёсак месца, канешне, палюбілася. Прыязджалі бавіць час госці з Гродна, Мінска і нават замежжа.

Услед за натоўпамі адпачывальнікаў падцягнуліся і мясцовыя ўлады. Па заканадаўстве пенсіянер не меў права «захопліваць тэрыторыю» і «займацца самадзейнасцю», хоць і з добрымі намерамі. Праверкі, штрафы і падтрымка соцень людзей, якія прыкіпелі да «пляцоўкі дзеда Славы» — за некалькі гадоў мужчына прайшоў праз усе бюракратычныя колы толькі таму, што «забавы зробленыя не па дзяржстандарце» і няма афіцыйнай асобы, якая б несла адказнасць за комплекс. Тут ужо нічога не скажаш: закон на тое і закон, каб яму падпарадкоўвацца. З другога боку, сам мужчына фактычна і быў назіральнікам за комплексам: і траву касіў, і прыбіраўся, і правяраў спраўнасць абсталявання. І ўсё ж на добрым слове такая справа трымацца не можа. У выніку вясковы актывіст і ўлады прыйшлі да кампрамісу. Сельсавет пачаў пакрысе яму дапамагаць. Праўда, гэта адзіны выпадак, які скончыўся мірна. Большасць самаробных дзіцячых пляцовак (а такія ёсць ледзь не ў кожнай другой вёсцы, толькі па маштабе меншыя) або застаюцца незаўважнымі, або дэманціруюцца.

**Ганна КУРАК.**

> У Беларусі дзейнічае адзіны дзяржстандарт, які прадугледжвае выраб, установку і эксплуатацыю абсталявання для дзіцячых гульнявых пляцовак. Фактычна адказнасць за пляцоўкі нясе тая арганізацыя, якая займаецца абслугоўваннем прыдамавой тэрыторыі.

### У тэму

Беларускія траўматолагі зазначаюць, што большасць дзіцячых траўмаў, атрыманых падчас гульняў на вуліцы, звязаныя з арэлямі. Урачы не стамляюцца паўтараць: лепш за ўсё, калі дзеці (асабліва дашкольнага ўзросту) гушкаюцца на іх пад наглядам дарослых. Акрамя таго, самым заўзятым аматарам гэтай забавы трэба нагадваць элементарныя правілы бяспекі. Напрыклад, зваліўся з арэляў — адразу не ўсковквай, бо яны ж без цябе працягваюць вагацца і могуць ударыць па галаве. На другім месцы па колькасці нанесеных траўмаў — каруселі. Тут часцей за ўсё бяда здараецца, калі падчас руху рукі, ногі і адзенне неспадзявана заціскаюць паміж элементамі абсталявання — трэба быць уважлівымі. Горкі — яшчэ адзін лідар па пастаўцы дзяцей у прыёмны пакой бальніц: адсутнасць борцікаў, няправільная ўстаноўка і нясвоечасовы догляд прыводзяць да падзення зверху.


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 02.10.2019 г. АУКЦИОНОВ

| Целевое назначение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Местонахождение земельного участка | Дополнительные сведения | Вид права | Дата и время проведения | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 324385604101000130 | 0,2100 | Гомельская область, Петриковский район, Петриковский сельсовет, деревня Новоселки, улица Набережная, 2Б | Возможность подключения электроснабжения, имеются ограничения в использовании земельного участка в связи с расположением в водоохранной зоне реки Припять | Аренда сроком на 99 лет | 02.10.2019 14.00 | 966,00 | 9,66 | 1 419,08 |
| Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 324385600601000180 | 0,1049 | Гомельская область, Петриковский район, Петриковский сельсовет, деревня Белановичи, переулок Октябрьский, 5 | Возможность подключения электроснабжения, имеются ограничения в использовании земельного участка в связи с расположением в водоохранной зоне реки Припять и охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000В | Аренда сроком на 99 лет | 02.10.2019 15.00 | 514,01 | 5,14 | 1 570,45 |

| | |
|---|---|
| Р/с для перечисления задатка | Р/счет Петриковского сельского исполнительного комитета BY53 AKBB 3604 4261 4159 6330 0000, ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21317, УНП 400031541 |
| Условия проведения аукциона | Шаг аукционов определен в размере 15 % от предыдущей объявленной цены. Первая объявленная цена определяется в соответствии с шагом аукциона к начальной цене предмета аукциона |
| Сроки приема заявлений, адрес, контактный телефон | С 1 сентября 2019 года по 1 октября 2019 года с 9.00 до 17.00, г. Петриков, ул. Гагарина, 17, отдел землеустройства Петриковского райисполкома, (здание Петриковского райисполкома, 2-й этаж, тел. + 375 (29) 3432199, Велком |
| Перечень документов, предоставляемых при подаче заявления | **Физическому лицу** – копия документа, содержащего идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования, квитанция о внесении задатка, **индивидуальному предпринимателю** – копия свидетельства о регистрации без нотариального засвидетельствования, квитанция о внесении задатка; **юридическому лицу** – доверенность выданная юридическим лицом или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копия свидетельства и копия устава юридического лица без нотариального засвидетельствования, заверенная копия платежного поручения о внесении задатка; **При подаче заявления все участники предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность** |
| Место проведения | **г. Петриков, ул. Гагарина, 17а, здание Налоговой инспекции по Петриковскому району, 3-й этаж, актовый зал** |
| Контактная информация | Подробная информация по телефону **+ 375 (29) 3432199, Велком** – отдел землеустройства Петриковского райисполкома (здание Петриковского райисполкома, 2-й этаж) |

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY.

Продавец: ОАО «Березина – Лада» (УНП 700067664), 213827, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 172, в лице ликвидатора Мороза Андрея Николаевича.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **30 сентября 2019 г**. с **09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб., без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 710/С–42016 (Здание цеха восстановления), общей площадью 518 кв. м, находящееся по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 172 | 37 200,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 710/С–77071 (Склад металлических конструкций), общей площадью 307,6 кв. м, находящееся по адресу: Могилёвская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 172 | 22 600,00 |

Тел. для ознакомления и осмотра + 375 (44) 773-51-18

**Для участия в торгах необходимо в срок по 27.09.2019 г. до 17.00:** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи



## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 12 сентября 2019 года на 16-м открытом аукционе проводит 14-й от 15 августа 2019 года повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности.

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 177 | Автоцистерна АЦ-7-43101 с/о 9010012 на КамАЗ–43101 ш. 0020825 дв. 0673442 1990 г. 4 кат. 61 866 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 14 900,00 | 2 980,00 |
| 181 | Грузовой бортовой КамАЗ-43105 ш. 007049 дв. 865837 1986 г. 4 кат. 47 661 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 10 000,00 | 2 000,00 |
| 182 | Грузовой бортовой КрАЗ-260 ш. 526023 дв. 922992 1985 г. 4 кат. 44 235 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 9 000,00 | 1 800,00 |
| 184 | Седельный тягач КрАЗ-260В ш. 538278 дв. 951950 1985 г. 4 кат. 13 942 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 9 700,00 | 1 940,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, **12 сентября 2019 г. в 10.30.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 9 сентября 2019 года.**

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **12 сентября 2019 г. с 9.00 до 9.45.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY51BPSB30121078830299330000, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-СберБанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп. 1, код BPSBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России, г. Москва, № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России № 30101810400000000225, без НДС. Справки по тел./факс: (017) 398 05 41. Ранее опубликованные извещение в газете «Звязда» № 126 от 09.07.2019 г.


ОРША: ПЕРАЗАГРУЗКА

# КІТАЙСКАЯ МОВА І АГРАРНЫЯ КЛАСЫ

## Што новага ў школах Аршанскага рэгіёна?

**УСТАНОВЫ адукацыі сустрэнуць дзяцей аднаўленымі і мадэрнізаванымі, паведамляе «Аршанская газета».**

У іх праведзены работы па частковым рамонце памяшканняў, азеляненні і добраўпарадкаванні тэрыторый. Адрамантаваны дахі ў 16 установах, фасады будынкаў гімназіі № 2, СШ № 20, 13 (спартыўная зала), Арэхаўскай, яслей-садкоў № 20, 27, 17, 18. Аднаўленыя майстэрні сустрэнуць вучняў СШ № 11. Таксама адрамантаваны харчаблокі ў гімназіі № 1, СШ № 2, 4, 12. Не засталіся без увагі і інжынерныя сеткі, вентыляцыйныя сістэмы, асфальтнае пакрыццё.

У мінулым навучальным годзе ва ўстановах адукацыі функцыянавала 6 класаў прафесійнай накіраванасці: педагагічныя, эканамічныя і медыцынскі. Упершыню ў СШ № 2 была арганізавана профільная група аграрнага кірунку. 49 % навучэнцаў (668 чалавек) вывучалі асобныя прадметы на павышаным узроўні, найбольш запатрабаванымі аказаліся руская мова (32 %), матэматыка і замежная мова (па 20 %).

Год таму ўпершыню ў СШ № 13 і 16 у трэціх класах былі адкрыты групы па вывучэнні кітайскай мовы як асноўнай замежнай. Сёлета плануецца пашырыць сетку школ




з вывучэннем кітайскай мовы факультатыўна. Сярод іх будуць і школы горада Барані.

Акрамя таго, у новым навучальным годзе ў дзесяці школах Аршаншчыны ў 10 класах створаць класы і групы аграрнай накіраванасці. Пачнуць працаваць два цэнтры дапрызыўнай і медыцынскай падрыхтоўкі на базе СШ № 3 і гімназіі № 1. На базе дзіцячай IT-акадэміі «КомпАС» цэнтра тэхнічнай творчасці дзяцей і моладзі з'явіцца лабараторыя «Робататэхніка і нейрапілатаванне».

ДЗЕЛЯ ПРАФІЛАКТЫКІ

# Гаджэты старшакласнікам — не больш за гадзіну!

## або Як прадухіліць развіццё школьна-залежных захворванняў?

**ЗА апошнія дзесяцігоддзе значна вырасла распаўсюджанасць школьна-залежных захворванняў: практычна кожны чацвёрты сярод навучэнцаў мае тую ці іншую паталогію зроку і знаходзіцца на дыспансерным уліку ў афтальмолага, са 100 вучняў прыблізна 40—50 маюць адхіленні ў развіцці апорна-рухальнага апарата, 10—20 — нервова-псіхалагічныя дысфункцыі. Што трэба ведаць бацькам школьнікаў, каб захаваць іх здароўе, карэспандэнт «МС» пацікавіўся ў загадчыка педыятрычнага аддзялення дзіцячай палікінікі № 2 г. Гродна Вольгі ТРАХІМІК.**

**— Хацелася б даведацца, якія захворванні можна лічыць школьна-залежнымі?**

— Згодна са статыстыкай, на першае месца выходзяць захворванні вачэй: блізарукасць, астыгматызмы, спазм акамадацыі, дальназоркасць. Другое месца ў градацыі школьных захворванняў трывала належыць хваробам апорна-рухальнага апарату, такім як парушэнне паставы, скаліёз, плоскаступнёвасць. На трэцім месцы захворванні нервовай сістэмы: вегетатыўная дысфункцыя, галаўны боль, неўрозы.

На іх развіццё значна ўплываюць працягласць зрокавых і эмацыянальныя напружанні, тое, што дзеці не прытрымліваюцца рацыянальнага рэжыма дня і харчавання, а таксама іх недастатковая рухальная актыўнасць. Дарэчы, чым вышэйшы школьны «стаж», тым вышэйшы адпаведная захваральнасць. Напрыклад, калі парушэнні зроку сярод першакласнікаў адзначаюцца ў 7—9 %, то сярод пяцікласнікаў іх удзельная вага ўжо складае 22—23 %, у 8 класах — 27—29 %, а ў 9—11 класах — 30—35 %. Такім чынам гэты паказчык павялічваецца ў чатыры разы.

**— Прычына ў напружаным школьным графіку?**

— Пагаршэнне зроку правакуюць вялікія нагрузкі падчас навучальнага працэсу, захапленне гаджэтамі і недастатковая прафілактыка блізарукасці на самай ранняй стадыі. Насцярожвае тэндэнцыя да павялічэння колькасці паталогій зроку ў дзяцей, якія ідуць у першы клас. У перыяд 2018—2019 гадоў амаль кожны дзясяты першакласнік меў паталогію зроку, чаго раней не было.

Таксама з узростам значна павялічваецца і распаўсюджанасць паталогій апорна-рухальнага апарата. Скаліёз і скаліятычныя дэфармацыі грудной клеткі рэгіструюцца ў падлеткавым узросце ў дзесяць разоў часцей, чым у першакласнікаў, што сведчыць пра значныя парушэнні функцый пазваночнага слупа, якія патрабуюць працяглай рэабілітацыі.

**— Як жа пазбегнуць пагаршэння здароўя дзяцей?**

— Неабходна прытрымлівацца некалькіх простых, але важных умоў, правераных жыццёвым вопытам і назіраннямі медыцынскіх работнікаў.

Па-першае, неабходна стварыць аптымальныя ўмовы для «работы вачэй» (дастатковая асвятляльнасць, святло павінна падаць злева зверху, кніга павінна знаходзіцца на падстаўцы на адлегласці 35 сантыметраў ад вачэй, адлегласць ад маніторa — даўжыня выцягнутай рукі дзіцяці, сядзець пры гэтым неабходна роўна перад экранам, для пачатковых класаў трэба выкарыстоўваць вялікі шрыфт).

Па-другое, трэба выконваць зрокавы рэжым і адэкватна размяркоўваць нагрузку. Гэта значыць, што трэба прытрымлівацца рэкамендацый да працягласці работы за камп'ютарам і карыстання гаджэтамі: у пачатковай школе 15 хвілін, у сярэдняй — да 30 хвілін, у 10—11 класах дазваляецца гадзіна бесперапыннай работы.

Акрамя таго, неабходна забяспечыць дзецям дастатковую працягласць адпачынку і сну — на працягу 8—10 гадзін.

Уплывае на здароўе школьнікаў і збалансаванае рацыянальнае харчаванне. Асаблівае значэнне маюць прадукты, якія ўтрымліваюць вітамін А, каратыноіды (морква, апельсіны, тыква, капуста, салат), вітамін С і прыродныя антыаксіданты (чарніцы, шыпшына, цытрусавыя, парэчкі, журавіны), вітаміны Е і В2, амега-3-поліненасычаныя тлустыя кіслоты, цынк, селен (раслінна масла, арэхі, авакада, мяса, рыба, яйкі, малочныя прадукты) і калій (бульба, дыня, разынкі, курага).

Штогод трэба кантраляваць зрок дзяцей: у школьным медкабінеце і пры неабходнасці кансультавацца ў афтальмолага. Штодня рабіць зрокавую гімнастыку пасля працяглай нагрузкі на вочы.

А яшчэ неабходна кантраляваць паставу. Трэба памятаць: няправільная поза за сталом першасная, а блізарукасць другасная!

**Гутарыла Вольга АНУФРЫЕВА.**


МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 29 жніўня 2019 года.**